незалежная газета

№ 35 (680) 15 верасня 2010 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Заснаваная ў лістападзе 1906. Адноўленая ў маі 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у серады



**Выбары адбудуцца на Міколу**

Старонка 3

**Пуцін замовіў знішчэнне Лукашэнкі?**

Старонка 3



**«Еўрабачанне»: ад Беларусі сын баптысцкага пастара**

Старонка 6

## У НУМАРЫ

**Кандыдат ад БНФ Рыгор Кастусёў**
чэмпіён па лазні. **Старонка 8.**

**Футбаліст «Нафтана» паказаў трыбунам голы зад**
Балельшчыкі: «Яго сапраўдны твар». **Старонка 13.**

«Наша Ніва» з'яўляецца ў кіёсках у Мінску ў сераду ад абеду, у рэгіёнах — у чацвер. На газету можна і падпісацца — глядзі **старонку 2.**

# Доля беларусаў

### Вынікі перапісу насельніцтва: беларусаў стала адносна больш, але яны русіфікуюцца.

8 верасня былі агучаныя першыя вынікі ўсеагульнага перапісу насельніцтва, што адбыўся 14—24 кастрычніка 2009 года. Паводле словаў Алены Кухарэвіч, намесніцы старшыні Нацыянальнага статыстычнага камітэта, жыхароў Беларусі паменела на паўмільёна. За дзесяць гадоў, якія мінулі ад перапісу 1999 года, колькасць жыхароў краіны скарацілася на 5,4%, ці 541 тысячу чалавек: было 10 045 000, а стала 9 504 000. Колькасна Беларусь вярнулася на ўзровень машэраўскіх часоў (перапіс 1979 г. зафіксаваў 9 535 000 насельніцтва).

Змяншэнне насельніцтва назіраецца ва ўсіх абласцях, найбольш істотнае — у Віцебскай. Толькі Мінск расце: колькасць яго жыхароў павялічылася на 157 тысяч і складае 1,837 млн.

### Беларусы асімілююць нацменшасці

Расце працэнтная доля беларусаў пры агульным змяншэнні колькасці насельніцтва. У параўнанні з перапісам 1999 года яна вырасла на 3% і складае 84%. А дваццаць гадоў таму, на хвалі саветызацыі, было толькі 77%. Аднак у абсалютных лічбах беларусаў за дзесяць гадоў паменела : з 8,16 млн да 7,96 млн.

### Мова — маральны выбар

Беларускую мову назвалі роднай 53% ўдзельнікаў перапісу. Мовай, на якой гавораць дома, яе палічылі 23%. Сярод этнічных беларусаў гэтыя лічбы складаюць 60% і 30% адпаведна.

У 1999 годзе беларускую мову лічылі роднай 73,6% жыхароў краіны, а ў сем'ях ёй штодзённа карысталася 37%. Вялікую частку беларускамоўных складалі, паводле таго перапісу, людзі старэйшага веку, якія за мінулае дзесяцігоддзе адышлі ў нябесную Беларусь.

Працяг на старонцы 11.

**Няпросты кампраміс прафесара Астроўскага**
Карэспандэнты «НН» правялі адзін дзень з сям'ёй выкладчыка гродзенскага Медуніверсітэта, які адстаяў права сваёй дачкі навучацца па-беларуску. **Старонка 10.**



Сабітава В.У. Расійская Федэрацыя, г.Екацярынбург.

# Генпракуратура дапускае, што Бябеніна забілі

Першыя звесткі пра расследаванне трагічнай смерці журналіста.



У панядзелак 13 верасня намеснік генпракурора Андрэй Швед заявіў журналістам, што следства адпрацоўвае некалькі версій смерці апазіцыйнага журналіста.

Асноўнай версіяй па-ранейшаму застаецца самагубства, аднак следчыя не выключаюць версіі забойства Бябеніна з наступнай інсцэніроўкай самагубства.

А.Швед назваў дэзінфармацыяй заявы сяброў журналіста пра тое, што на ягоным целе былі заўважаныя пашкоджанні, у прыватнасці вывіх правай ступні, драпіны і плямы на руках і целе.

Паводле інфармацыі следства, Бябенін сам узяў ключы ад дачы, сам набыў спіртное. Менавіта ў часе набыцця алкаголю ён зрабіў апошні — прыватнага характару — званок па мабільным тэлефоне.

Згодна з экспертызай, на момант смерці ён знаходзіўся ў стане моцнага алкагольнага ап'янення, і піў сам.

Міністэрства замежных спраў заявіла пра гатоўнасць азнаёміць з матэрыяламі праверкі смерці Алега Бябеніна экспертаў АБСЕ. Пытанне аб накіраванні ў Беларусь экспертаў-крыміналістаў вывучаецца, паведаміў супрацоўнік прадстаўніцтва АБСЕ ў Беларусі Жандос Асанаў.

Таямнічая смерць апазіцыйнага журналіста прыцягнула ўвагу заходніх краін. За расследаваннем паабяцалі сачыць дакладчыца Парламенцкай асамблеі Рады Еўропы па Беларусі Сініка Хурскайнен, Вярхоўная прадстаўніца Еўрасаюза па замежных сувязях і палітыцы бяспекі Кэтрын Эштан і прадстаўніца АБСЕ па пытаннях свабоды СМІ Дуня Міятавіч. За сітуацыяй у Мінску ўважліва сочыць МЗС Літвы.

Да ўладаў Беларусі звярнулася Еўрапейская федэрацыя журналістаў. Занепакоенасць выказала арганізацыя «Індэкс цэнзуры» (Index on Censorship).

Нагадаем, што 3 верасня 2010 Алег Бябенін быў знойдзены павешаным на сваёй дачы ў вёсцы Пярхурава Дзяржынскага раёна. Эксперты-за ўстанавіла, што прычынай смерці з'яўляецца асфіксія.

«Алега знайшлі ў наглуха зашпіленай куртцы». Што ўбачылі сябры Бябеніна на месцы трагедыі. **Старонка 5.**

## Сцісла

• **Кыргызстан больш не будзе патрабаваць выдачы Бакіева.** Ён можа быць асуджаны завочна, заявіў у аўторак віцэ-прэм'ер Кіргізіі Азымбек Бекназараў, які курыруе праваахоўныя органы.

• **АМАП збіваў настаўнікаў?** Віцебская пракуратура шукае сведкаў інцыдэнту, што адбыўся падчас закрыцця фестывалю «Славянскі базар». Трое настаўнікаў заяўляюць, што іх беспадстаўна збілі супрацоўнікі мінскага АМАПа, што ахоўвалі парадак. Міліцыянты ж лічаць, што настаўнікі вінаватыя самі: маўляў, падышлі да прапускнога пункта і пачалі мацюкацца.

• **Журналіста Пачобута апыталі наконт чутак пра замах на Лукашэнку.** Падставай для выкліку ў міліцыю стаў допіс у блогу. У прыватнасці словы: «Нядаўна быў у Лідзе. Рэальна чуў такія байкі». Гутарылі з Андрэем Пачобутам ва Упраўленні па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй па Гродзенскай вобласці. «У мяне пыталі, хто мне расказаў пра тое, што на Дажынках заб'юць Лукашэнку. Ці ведаю я невядомага дзядулю — героя чутак пра замах у Лідзе».

• **Закупныя цэны на грэчку павялічаныя на 50%.** Беларусь таксама спыніла экспарт гэтага збожжа. Цэны на грэчку выраслі ў выніку засухі ў Расіі.

• **Намеснік дырэктара фірмы заснуў у казіно і страціў 1800 долараў.** Юнак выцягнуў грошы з кішэні яго кашулі. Злодзея затрымалі супрацоўнікі Маскоўскага РУУС сталіцы на падставе кадраў сістэмы відэаназірання.

• **Атруціцца можна нават баравікамі.** Клінічны малюнак на пачатковых стадыях захворвання выглядае так: рэзкі боль у жываце, моцная рвота, панос, слабасць, галаўны боль. Потым да гэтых сімптомаў могуць далучыцца сутаргі, галюцынацыі, трызненне. Нават ядомыя грыбы нельга збіраць каля аўтамабільных трас, у радыеактыўных зонах. У старых грыбах таксама ўтвараюцца высокатаксічныя спалучэнні.

**Сямён Печанко, «Народныя навіны Віцебска», БЕЛТА, БелаПАН**

САЛІДАРНАСЦЬ

## «Аўтарадыё» просіць аб падтрымцы

Музычная радыёстанцыя прапануе сваім слухачам падтрымаць яе шляхам дабрачыннай падпіскі.

Гендырэктар станцыі Юрый Базан расказаў, што гэта распаўсюджаная практыка для заходніх краін. «У нас не развіты інстытут падтрымкі СМІ на дабрачыннай аснове, што існуе ў свеце. І некамерцыйныя праекты ў такім выпадку ствараць цяжка. Мы маем бясплатныя газеты, але мы ведаем, чым яны запоўненыя — рэкламай. А ў нас у музычным шэрагу шмат кампазіцый некамерцыйнага характару. Таму і вырашылі паспрабаваць дабрачынную падпіску».

Сэнс акцыі заключаецца ў тым, што слухач тэлефануе з гарадскога тэлефона на нумар 8-902-101-09-09, а з яго рахунка на карысць радыёстанцыі пералічваецца пэўная сума грошай.

На «Аўтарадыё» яна складае пяць тысяч рублёў.

Цяпер вядуцца перамовы з сотавымі аператарамі, каб і з мабільнікаў можна было ахвяраваць. Бо шмат людзей слухае радыё за рулём аўтамабіля.

Юрый Базан першыя вынікі лічыць нядрэннымі, хоць акцыя ладзіцца яшчэ ў пробным рэжыме.

«Аўтарадыё» ставіць на сваіх хвалях найбольш беларускамоўнай і незалежнай музыкі між усіх станцый.

**Кастусь Матушыч**

ВАРТА БЫЦЬ

**16 верасня ў Горадні** адбудзецца прэзентацыя нумара часопіса ARCHE «Праваднік па яўрэйскай Горадні».

У падрыхтоўцы нумара ўдзельнічалі Мацяс Баціс, Уладзімір Буцько, Надзея Крапівіна, Аляксандр Паняеў, Вольга Сабалеўская, Юлія Фядосава, Эва Ханф, Ганна Шлёгель, Валерыя Калодзіна, Ганэтэ Коркхіл.

Удзел у прэзентацыі возьмуць аўтары нумара, а таксама рэдактары ARCHE Валер Булгакаў і Алесь Пашкевіч.

**Пачатак прэзентацыі 16 верасня ў 18.30 на вул. Будзённага, 48а — зала 69** (карацейшы шлях на падыходзе да будынка і ў самім будынку будзе пазначаны стрэлкамі).

Уваход вольны.

### Самае чытанае на nn.by за 8—14 верасня

- Міс Грудзі Беларусі
- Беларусаў стала больш, але яны русіфікуюцца
- Папярэджанне Лукашэнку ці фэйк спецслужбаў?
- Сям'я Латыпавых
- «Алега знайшлі ў наглуха зашпіленай куртцы»
- Выбары на дзень Святога Мікалая
- Праграма «Максімум» на НТВ пра Алега Бябеніна
- Мінск. Мегадзень горада
- Новы кандыдат на пасаду прэзідэнта — Віктар Цярэшчанка
- Футбаліст «Нафтана» паказаў заўзятарам голы зад

nn@nn.by

### «Няма ніводнага прадукта, які б патаннеў за год» (№34)

Псіхалагічна больш дарагі прадукт успрымаецца як больш якасны. Таму, каб не псаваць настрой сабе і ўладзе, давайце будзем лічыць, што прадукты за год сталі больш якаснымі.

**Кнехт**


# Не ўсё ў жыцці апошні раз!

### Падпіска праз Рэдакцыю

Цана падпіскі праз Рэдакцыю на месяц складае 7500 рублёў.

Мы рэкамендуем падпісвацца праз Рэдакцыю.

Наша сістэма дастаўкі газеты за 3 гады даказала сваю надзейнасць. Мы зможам даставіць Вам газету хутчэй або з той жа хуткасцю, што «Белпошта».

Каб штотыдзень атрымліваць газету, дасылайце адрасы і грошы за газету.

1) Просім усіх ахвотных падпісацца паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз: тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Мінск, а/с 537.

2) Просім у бланку банкаўскага паведамлення ці паштовага пераказу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езда.

**Банкаўскія рэквізіты (змяніліся з 1 мая):**

ПВУП «Суродзічы», УНП 190 786 828

Аддз. № 539 ААТ «Белінвестбанк», вул. Калектарная, 11, Мінск, код 739

Рахунак атрымальніка: 3012 740 628 011

Від аплаты: За газету «Наша Ніва»

### Падпіска праз «Белпошту»

Цана гэтай падпіскі — 8 520 руб. на месяц.

Падпісныя індэксы ў каталогу «Белпошты»: для людзей — 63125, для прадпрыемстваў — 631252. Падпісацца можна на кожнай пошце.

### Дзякуй падпісчыкам,

які падпісваюцца праз Рэдакцыю

Раману М., Віктару Д., Валянціне Н., Але Р., Г.Е., Ганне Г., Ігару Х., Леаніду І., С.І., Ірыне В., Ларысе С., Ф.П., Святлане Ш., Тацціяне М., Аляксандру К., Сяргею Р., Валянціну К., С.Р., Уладзіміру К., В.П., Аркадзю Б., М.З., Валянціне М., Я.А., Н.К., Барысу А., Н.Ш., Андрэю Ф., Тацціяне М., І.С., Зінаідзе Б. з Мінска.

# Выбары на дзень Святога Мікалая

**Прэзідэнцкія выбары адбудуцца 19 снежня 2010 года.**

Адпаведную пастанову прыняла 14 верасня палата прадстаўнікоў нацыянальнага сходу на сваёй нечарговай сесіі. «За» прагаласавалі аднагалосна ўсе 108 прысутных дэпутатаў.

Пытанне аб разглядзе даты выбараў было ўнесенае ў парадак дня пасяджэння сесіі ніжняй палаты парламента саветам рэспублікі за некалькі хвілін да пачатку пленарнага пасяджэння.

Прызначэнне выбараў на 19 снежня падкрэслівае фармальнасць гэтай працэдуры пры цяперашняй палітычнай сістэме. На свабодных выбарах ніколі няможна выключаць другі тур. Але ў выпадку правядзення першага 19 снежня ён прыпадае на нязручныя даты — 26 снежня і 2 студзеня. Пра другі тур, выходзіць, ніхто ўсур'ёз не думае. У аўтарытарнай сістэме пераможца забірае ўсё.

Цікавае супадзенне — 19 снежня святкуюць дзень Святога Міколы зімовага. У гэтым можна пабачыць пэўны сімвалізм — любімага сына Лукашэнкі завуць Колем.

Сярод іншых святочных датаў варта адзначыць Дзень супрацоўніка дзяржаўнай бяспекі, які сёлета будзе адзначацца акурат пасля выбараў — 20 снежня. У мінулы раз у паслявыбарныя дні супрацоўнікі спецслужбаў былі масава задзейнічаныя ў здушэнні акцый пратэстаў на Плошчы.

Мінулыя выбары таксама адбыліся ў 19-ы дзень месяца, адно што ў сакавіку. А прызначаныя былі за тры месяцы да даты правядзення — 16 снежня 2005 года. Сёлета сцэнар паўтарыўся да драбніцаў.

**Алесь Пілецкі**

# «Гэты крыж давядзецца браць Віталю Рымашэўскаму»

**12 верасня адбыўся трэці ўстаноўчы з'езд БХД.**

Арганізацыйныя моманты на гэты раз былі другаснымі. На парадку дня стаяла пытанне ўдзелу партыі ў прэзідэнцкіх выбарах.

З'езд быў не настолькі прадстаўнічы, як мінулыя. Паводле Паўла Севярынца, на яго адбіраўся адзін дэлегат ад дзесяці партыйцаў. Агулам жа ў ім узялі ўдзел 135 дэлегатаў.

Паўла Севярынца прадстаўлялі як «лідар, сустаршыня БХД». Свой справаздачны выступ ён вырашыў зрабіць арыгінальным. Замест звычайнай прамовы склаў рэйтынг топ-10 дасягненняў БХД за апошні год. Так на дзявятым месцы апынулася тое, што партыйцаў зараз у «хадэкаў» больш, чым у іх папярэднікаў у першай палове XX ст. На восьмым — альтэрнатыўны ўрад. На пятым — частыя ўзгадкі на БТ. На трэцім — тры дэпутаты ў мясцовых органах самакіравання. На першым — гадаванне новых лідараў.

Прадпрымальнік Георгій Дзмітрук з Кобрына засярodзіўся на эканамічным аспекце. Ён прапанаваў свае крокі для выхаду Беларусі з эканамічнага крызісу. Тут табе і падатковая амністыя, і льготная легалізацыя даходаў, і трохгадовы мараторый на прыватызацыю, і магчымасць для індывідуальных прадпрымальнікаў наймаць работнікаў, і адзіны тарыф на ўвоз аўтамабіляў.

«БХД не прымае дзікага капіталізму. Мы прапануем сацыяльна-эканамічную платформу, асабліва ў пераходны перыяд», — сказаў Г.Дзмітрук.

«А цяпер перад вамі выступіць самы прывабны кандыдат на пасаду прэзідэнта ў выбарах-2010», — так П.Севярынец прадстаўляў партыйнага вылучэнца Віталя Рымашэўскага. Кандыдат усміхнуўся на гэта: «Я не імкнуся спадабацца ўсім. Дастаткова спадабацца самым лепшым».

Кандыдат хрысціянскіх дэмакратаў паведаміў, што наведаў усе рэгіёны краіны, дзе сустракаўся як са сваімі аднапартыйцамі, так і з партнёрамі з іншых арганізацый, але «ніводнага разу не пачуў нічога негатыўнага аб дзейнасці БХД».

Віталь заклікаў прысутных застаназвана самакрытычнымі, але самакрытыкі з ягоных вуснаў не прагучала.

Падышла чарга вырашаць пытанне аб удзеле ў прэзідэнцкіх выбарах. Перад гэтым Павел Севярынец зрабіў невялікую даведку аб цяперашняй сітуацыі ў краіне. Фарбы атрымаліся змрочныя, калі не апакаліптычныя.

Паводле Севярынца, сёння Расія дамагаецца поўнага паглынання Беларусі, а Лукашэнка ўсяляк спрабуе вывернуцца. «Рэжым увайшоў у канфрантацыю з імперыяй. Пакуль яны знішчаюць адно аднаго, трэба нарошчваць мускулы, каб уклініцца ў гэтую барацьбу і перамагчы», — кажа былы палітвязень.

Сустаршыня БХД сказаў, што ўсе астатнія нацыянальныя сілы аслабленыя, таму адказнасць за будучыню мусяць браць яны. «Пазняк у выбарах не ўдзельнічае. Казулін таксама. Мілінкевіч, які да нядаўняга часу карыстаўся нашым аўтарытэтам, хутчэй за ўсё таксама не будзе, — зазначыў П.Севярынец. — Цяпер гэты крыж давядзецца браць Віталю Рымашэўскаму. Стаўкай ёсць усё».

Пытанне ўдзелу ці няўдзелу не абмяркоўвалася ўвогуле. Адназначна ўдзельнічаць. Агулам пункты выбарчай стратэгіі гучаць так:

1. Вылучыць Віталя Рымашэўскага кандыдатам у прэзідэнты. 2. Каардынаваць назіранне, працу ў камісіях, а таксама пратэставыя акцыі ў выпадку рэгістрацыі А.Лукашэнкі з іншымі дэмакратычнымі сіламі. 3. Падчас кампаніі гуртаваць людзей у БХД, прапагандаваць хрысціянскія каштоўнасці. 4. Калі кандыдат не будзе зарэгістраваны, то заклікаць да байкоту і выхаду на Плошчу.

**Зміцер Панкавец**

**Віталь Рымашэўскі**

нарадзіўся ў 1975 у Бабруйску. Закончыў будаўнічы факультэт Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўніверсітэта па спецыяльнасці «інжынер–будаўнік». У маі 2009 быў абраны кандыдатам ад БХД на наступных прэзідэнцкіх выбарах. Жанаты, мае дачку.

PHOTO.BYMEDIA.NET



**«У імя Айца, і Сына...» Віталь Рымашэўскі — кандыдат ад хадэкаў.**

# Папярэджанне Лукашэнку ці фальшыўка спецслужбаў?

**У інтэрнэце з'явіўся ролік з папярэджаннем, што Пуцін рыхтуе фізічнае знішчэнне Лукашэнкі.**



«Былы супрацоўнік адной са спецслужбаў Расійскай Федэрацыі» вырашыў папярэдзіць Аляксандра Лукашэнку аб падрыхтоўцы яго фізічнага знішчэння праз відэасайт youtube.com.

Маўляў, забойства лідара Беларусі замовіў сам прэм'ер-міністр Расіі. У кадры з'яўляецца зацемненая постаць чалавека, які сіпатым ненатуральным голасам начытвае тэкст.

«Старшыня ўрада Расіі Пуцін хоча забіць прэзідэнта Беларусі Лукашэнку. Я заяўляю аб гэтым з усёй адказнасцю, бо валодаю праўдзівымі фактамі», — адразу гаворыцца ў відэапасланні.

«Каб прыбраць Лукашэнку, у нас ёсць цэлы набор нармальных сродкаў і метадаў. Нашы СМІ могуць зляпіць з Лукашэнкі які заўгодна вобраз — вар'ята або хворага. Мы можам паставіць яго на калені эканамічна — праз пастаўкі нафты і газу. Мы можам, урэшце, дамовіцца з Еўропай, Злучанымі Штатамі. І гэтага дастаткова — Лукашэнка абрынецца. Але для мяне абсалютна непрымальныя метады фізічнай ліквідацыі прэзідэнта Беларусі, якія плануе выкарыстоўваць кіраўніцтва маёй краіны». Можна паставіць пад сумнеў такія тэзы.

Гняздом спецаперацыі па ліквідацыі Аляксандра Лукашэнкі абвешчана пракрамлёўская дзяржкарпарацыя «Растэхналогіі». Не сакрэт, што пад крылом яе кіраўніка Сяргея Чэмезава збіраецца багата былых супрацоўнікаў ФСБ і іншых сілавых структур.

Чаму менавіта «Растэхналогіі» названа месцам падрыхтоўкі замаху? Можа, таму, што там знайшоў працу былы міністр унутраных справаў Уладзімір Навумаў. Ёсць меркаванне, што напярэдадні выбараў Навумаў можа быць скарыстаны расійскай прапагандай супраць кіраўніка Беларусі.

«Група па фізічнай ліквідацыі прэзідэнта Беларусі строга засакрэчаная. У яе ўваходзяць толькі самыя праверанія і адданыя Пуціну сілавікі. Ужо адпрацавана некалькі сцэнараў знішчэння Лукашэнкі: аўтамабільная або авіяцыйная катастрофа, заражэнне праз падарунак або паштовае адпраўленне, задзейнічанне снайпера», — кажа закадравы голас.

«Але ў якасці найбольш рэальнага сцэнара разглядаецца правядзенне маштабнага тэракта падчас аднаго з масавых мерапрыемстваў з удзелам Лукашэнкі». Гэта атрымлівае сугучча з нядаўняй байкай, што кіраўніка Беларусі заб'юць падчас святкавання Дажынак у Лідзе.

Гэтая гісторыя атрымала шырокі розгалас не толькі на Гродзеншчыне, але ва ўсёй краіне. Нібыта смерць Лукашэнку прадказаў стары дзядуля.

«Для стварэння атмасферы панікі плануецца правесці ў найбліжэйшыя месяцы ў Беларусі серыі страшэнных акцый з выкарыстаннем выбуховых прылад, распрацоўваюцца сцэнары выкрадання вядомых людзей». Ці не выбух у расійскім пасольстве і загадкавая смерць Алега Бябеніна падштурхнула да такіх прагнозаў?

«Адкуль гэтыя факты вядомыя мне? Ёсць прыстойныя людзі і ў гэтай спецгрупе». Цікава, але ж ніякіх фактаў ад «прадстаўніка спецслужбаў» мы так і не пачулі. Відэа больш падобна на кактэйль розных чутак і плётак, што ходзяць унутры беларускага грамадства ўжо не першы дзень. Таму гэта больш нагадвае звычайны фэйк, падробку. Прычым, не вельмі якасную.

Гэта маглі выкарыстаць самі беларускія спецслужбы хоць бы дзеля таго, каб паказаць, як Лукашэнка нічога не баіцца. А яшчэ чарговы раз нагадаць, што небяспека ідзе з Масквы.

У прэс-службе Пуціна ж на гэты фільм адказалі, што ў Беларусі пачалася «перадвыбарчая шызафрэнія».

**ЗП**

**Лукашэнкаўскі палітолаг: Масква нападае на Лукашэнку за рост нацыянальнай самасвядомасці**

Кіраўнік лукашэнкаўскага аналітычнага цэнтра EcooM мяркуе, што распаўсюд чутак пра падрыхтоўку тэракта супраць Лукашэнкі выгадны расійскім спецслужбам.

Пра гэта Сяргей Мусіенка заявіў у інтэрв'ю агенцтву «Інтэрфакс». Мусіенка мяркуе, што «Крэмль чамусьці вырашыў, што праблема ў беларуска–расійскіх адносінах заключаецца ў фактары Лукашэнкі». Між тым, на думку палітолага, «пытанне стаіць значна шырэй: справа ва ўсведамленні беларускім народам свайго месца ў гісторыі».

Аналітык перакананы, што «рост нацыянальнай самасвядомасці ў апошні час — заслуга Аляксандра Лукашэнкі, і гэтая тэндэнцыя палохае Крэмль, які і інспіруе такія відэаправакацыі».

**МБ**

## Сцісла

• **Лукашэнка паедзе ў Кітай, абяцае стос кантрактаў.** У кастрычніку прэзідэнт Беларусі наведае з афіцыйным візітам Кітай, у ходзе якога плануецца заключыць шэраг буйных кантрактаў.

• **Дату правядзення Усебеларускага сходу яшчэ не прызначалі.** Дату правядзення IV Усебеларускага сходу павінны прызначыць падчас аднаго з бліжэйшых пасяджэнняў аргкамітэта. Пра гэта паведаміла першая намесніца кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Наталля Пяткевіч. Па яе словах, пакуль немагчыма сказаць — да Новага года пройдзе гэты сход ці пасля.

• **Міхась Башура чакае суда.** Паэт і актывіст кампаніі «Гавары праўду» знаходзіцца ў Жодзінскім СІЗА. Ён чакае рашэння пракуратуры, якая правярае ягоную крымінальную справу. Найхутчэй, што потым справа будзе перададзеная ў суд. Башуру абвінавачваюць у падробцы дакументаў з мэтай атрымання крэдыту.

• **З Акрэсціна вызвалілі пяць з дзевяці анархістаў.** На волю выйшлі Антон Лапцёнак, Ігар Багачак, Сяргей Слюсар, Валерыя Хоціна і Аляксей Жынгароўскі. Нікому з арыштаваных анархістаў ніякіх абвінавачанняў не прад'явілі. Іх затрымлівалі па справе аб падпале машыны каля расійскага пасольства. Зняволенымі застаюцца Таццяна Семяншчава, Аляксандр Бугаёў, Мікалай Дзядок і Аляксандр Францкевіч. Апошняга абвінавачваюць у нападзе на пастарунак міліцыі ў Салігорску (ч.2 арт. 339 «Хуліганства»). За кратамі застаюцца таксама Ігар Чапіга з «Правага альянсу», эколаг Уладзімір Валодзін і Сяргей Папоў з незарэгістраванай Партыі свабоды.

**ЗП**

# Расія пусціла да сябе патрыманыя аўто з Беларусі

Аўтаперагоншчыкі радуюцца. У дылераў свая нагода для задавальнення.

Да таго, што правілы гульні змяняюцца ўладамі пастаянна, аўтамабільны рынак прывык ужо даўно. То мыты на ўвоз патрыманых аўто павышаюцца, то застаюцца на ранейшым узроўні. То як быццам бы ўводзяцца абмежаванні на колькасць завезеных машын, то гэтая ідэя паспяхова забываецца. І вось цяпер выявілася, што Расія, якая раней ставіла заслону перад наплывам б/к машын з Беларусі, прыбрала яе.

### Гульня заднімі датамі

Беларускія аўтаперагоншчыкі, якія накуплялі машын перад стварэннем Мытнага саюза, змогуць прадаць іх расіянам бязмытава. Праўда, дазвол датычыцца толькі «перадНавагодніх аўто». Паводле ліста Федэральнай мытнай службы Расіі ад 19 ліпеня 2010 № 01—11/35237 «Аб ажыццяўленні мытных аперацый і мытным кантролі аўтамабіляў для асабістага карыстання, якія перамяшчаюцца праз расійска-беларускі ці расійска-казахстанскі ўчасткі дзяржаўнай мяжы Расійскай Федэрацыі», у Расію можна бязмытна ўвозіць патрыманыя аўтамабілі, калі ў Беларусь яны былі ўвезеныя да 1 студзеня 2010 (і адпавядаюць нормам «Еўра-4»).

Гэта значыцца, што прыгнаць зараз з суседніх Літвы ці Польшчы аўто, каб адразу ж перапрадаць яго расіянам, не ўдасца. «Удакладненне» ў законе спрацоўвае толькі ў сітуацыі, калі гаворка вядзецца пра аўто, увезенае да 2010 года.

На мінскім аўтарынку «Малінаўка» навіна не выклікала ажыятажу. Па словах прадаўцоў, тлумачэнне простае — у продажы засталося няшмат аўтамабіляў, якія стаяць у Беларусі ўжо больш за дзевяць месяцаў. Змірыўшыся з тым, што перагнаць машыны ў Расію не ўдасца, мясцовыя перагоншчыкі прадавалі іх ледзь не па любой цане, абы адбіць патрачаныя грошы.

Нагадаем, што, насуперак абвешчанай інфармацыі, з 1 ліпеня 2010 года мыты на ўвоз патрыманых аўтамабіляў грамадзянамі Беларусі засталіся нязменнымі. Чакалася, што яны вырастуць да ўзроўню расійскіх, але гэтага не адбылося.

### Старое даражэйшае за новае

Разам з тым, на «прахадныя» аўто цэны насамрэч узняліся, на $300—500. «Гэта кампенсацыя нам за згарэлыя нервовыя клеткі», — усміхаюцца прадаўцы. Па іх словах, усё роўна цэны атрымліваюцца таннейшымі за расійскія.

— Напрыклад, у мяне, сярод іншых машын, непрададзеныя два «Форды Фокусы» з фактычна аднолькавай камплектацыяй. Адзін старэйшы, другі навейшы. Па логіцы, я павінен на новы паставіць трохі большую цану і спачатку збыць стары. Але я раблю наадварот, бо на стары можа знайсціся пакупнік-расіянін, які будзе гатовы расшчодрыцца, — тлумачыць «спецыяліст» па нямецкіх аўто.

Інфармацыя пра неспадзяваны дазвол ад расійскіх уладаў патроху разыходзіцца па расійскіх абласцях, блізкіх да Беларусі, хоць купцоў-расіян пакуль што мала. А вось расійскія перагоншчыкі цэняцца моцна. Яны гатовыя выступіць пасярэднікамі і давезці аўто да кліента, напрыклад, у Смаленску ці Бранску. Прадаўцы з «Малінаўкі» кажуць, што мала хто з расейцаў рызыкуе адпраўляцца ў суседнюю краіну, каб ашчадзіць $500. Для іх прымальны іншы варыянт, калі «зніжка» складзе ўсяго $250 — другую палову забярэ перагоншчык, — але машына будзе давезеная да іх дома.

### Дылеры таксама не ў крыўдзе

Расійскія СМІ выявілі і розніцу ў цэнах на новыя аўтамабілі ў Расіі і ў Беларусі, закладзеную ў заканадаўстве. Па ўмовах Мытнага саюза, машыны, размытненыя ў Беларусі юрыдычнай асобай — напрыклад, дылерам, — можна ўвозіць у Расію без абмежаванняў — і, як аказалася, гэта вельмі выгадна.

Але ў нашай краіне ПДВ у 20% налічваецца толькі на розніцу паміж закупной і адпускной цаной аўтамабіля. А ў Расіі ПДВ у 18% налічваецца на поўную рознічную цану аўтамабіля.

Па сярэдніх падліках, машына адпускным коштам у $10 тысяч з мытам, дылерскім прыбыткам і падатковых плацяжах у Расіі будзе каштаваць $17 700, а ў Беларусі — $15 400. Хоць самі дылеры ў выніку плацяць дзяржаве прыкладна аднолькавую суму — бо расійскія атрымліваюць потым пэўны вылік, — для грамадзянаў пакупка ў Беларусі значна больш выгадная, чым у Расіі. І чым даражэйшы аўтамабіль, тым розніца становіцца большай.

**Яўген Васількоў**

**Колькасць увезеных патрыманых аўтамабіляў грамадзянамі Беларусі**

I паўгоддзе 2009 — 71 000 аўто

I паўгоддзе 2010 — 113 800 аўто

Крыніца — Белстат

# Ад Навашына адвялі, дарога пойдзе па іншых вёсках?

Жыхары Навашына трыумфуюць: «У нас трасы не будзе. Дзе будзе — не наша праблема».

У праекце будаўніцтва Другой аб'язной дарогі вакол Мінска — своеасаблівага дублёра цяперашняй МКАД — чарговыя змены. Як ужо пісала «Наша Ніва» ў №33, першасны праект прадугледжваў, што траса пройдзе праз некаторыя населеныя пункты. Гаворка вялася пра вёскі Навашына і Лашаны ля Заслаўя.

Уладальнікі некалькіх дзясяткаў участкаў атрымалі з сельсавета апавяшчэнне з наступным зместам: ваша зямля падлягае адчужэнню, таму працэдуры перадачы яе ў іншую ўласнасць ці продаж забароненыя.

Людзі, якія спецыяльна набывалі сабе зямлю ў ціхім экалагічным раёне ў 20 кіламетрах ад Мінска, аказаліся катэгарычна нязгодныя з такім рашэннем. Атрымаць замест уладкаванага жытла незразумелую кампенсацыю — не надта прыемная перспектыва.

Жыхары пачалі папяровую вайну супраць распрацоўшчыкаў праекта і чыноўнікаў, якія былі гатовыя фактычна падпісаць прысуд неселенаму пункту. Гэтая барацьба нечакана скончылася часовай перамогай.

### «Галоўнае, каб было кола. І без мастоў!»

Спачатку жыхары Навашына прапанавалі «Белгіпрадору», арганізацыі-праектавальніку, сваю дапамогу — разам пракласці па карце трасу так, каб не засталося пакрыўджаных. Выявілася, што існуюць негалосныя патрабаванні чыноўнікаў да праекта. Некаторыя з іх выклікалі асаблівае абурэнне ўласнікаў пляцаў у Навашыне. «Напрыклад, важна, каб траса ішла з раўнамерным закругленнем на ўсёй адлегласці», — расказвае жыхарка Навашына, якая асабіста прымала ўдзел у абмеркаванні. Гэта важна для бяспекі руху, але навашынцы пра тое чуць не хочуць.

Дзяржава не хоча траціць уласныя грошы на будаўніцтва, чакае сродкі інвестараў і пастаралася зрабіць праект максімальна танным. Таму прапановы, у якіх населеныя пункты пакідалі ў спакоі, але патрэбна было будаўніцтва мастоў ці пуцеправодаў, адхіляліся.

### «У нас трасы не будзе. Дзе будзе — не наша праблема»

Дапамога прыйшла адтуль, адкуль яе не чакалі. «Белгіпрадор» сам прапанаваў іншы праект, у якім траса абыходзіць Навашына і Лашаны за некалькі кіламетраў. Праўда, пры гэтым не могуць не «зачапіцца» іншыя вёскі. На жаль, канкрэтнай інфармацыі інстытут не дае. «Сачыце за публікацыяй нашых праектаў, — параілі распрацоўшчыкі. — Калі будзе зацверджаны канчатковы, вы пра ўсё даведаецеся».

Хоць справядлівасці ад змены вёсак-ахвяр не пабольела, навашынцы трыумфуюць: «У нас трасы не будзе. Па чыіх дамах яна пойдзе — гэта не наша праблема».

Хоць жыхары Навашына пакуль і не атрымалі пісьмовага пацвярджэння, што ранейшыя «апавяшчэнні» адмененыя, яны настроены пазітыўна, бо знайшлі падтрымку на ўзроўні намесніка міністра архітэктуры і горадабудаўніцтва.

**P.S.** Тым не менш, на выставе «Будэкспа-2010», якая праходзіла ў Мінску на мінулым тыдні, наведвальнікам быў прэзентаваны для агляду той самы стары праект, які хавае пад трасай Навашына.

**ЯВ**

# Кітайскія грошы будуць кіраваць транспартам Мінска

У сталіцы будзе створана інтэлектуальная транспартная сістэма.

Улады спрабуюць прадухіліць магчымае з'яўленне пробак і звязанае з гэтым пагаршэнне працы грамадскага транспарту.

Паводле слоў старшыні Мінгарвыканкама Мікалая Ладуцькі, праект плануецца рэалізаваць у канцы 2013 — пачатку 2014 года. Грошы на яго дасць Кітай, зараз у гэтай краіне знаходзяцца спецыялісты, якія вядуць перамовы наконт канкрэтных інвестыцыйных дамоў. Памер фінансавання будзе вызначаны пасля завяршэння экспертызы праекта.

Сутнасць праекта ў стварэнні сістэмы, якая аптымізуе працу святлафораў на скрыжаваннях. У тэорыі гэта дазволіць павялічыць прапускную здольнасць вуліц на 20—25%.

Сістэма таксама прадугледжвае электронны кантроль аплаты за паркоўку, відэафіксацыю парушэнняў ПДР, у тым ліку хуткасці аўто, і ўстаноўку на прыпынках электронных табло з інфармацыяй пра час прыбыцця транспарту.

**ЯВ**

# Стаўка рэфінансавання апускаецца да 10,5%

Нацбанк Беларусі ў чарговы раз зніжае стаўку рэфінансавання. З 15 верасня яна апусціцца з 11% да 10,5%. Апошняе зніжэнне адбылося менш за месяц таму, 18 жніўня.

Стаўка рэфінансавання ўплывае на стаўку па крэдытах і дэпазітах.

Нізкая стаўка сведчыць пра стабільнасць эканомікі і нізкую інфляцыю, праўда, незалежныя эканамісты мяркуюць, што Нацбанк штучна заніжае паказчык.

Найменшы паказчык у гісторыі беларускай эканомікі — 10% — фіксаваўся ў канцы 2006 і канцы 2007 гадоў. Найбольшы, ажно 480%, быў у пачатку прэзідэнцтва Лукашэнкі, у 1994 годзе.

**ЯВ**

# «Алега знайшлі ў наглуха зашпіленай куртцы»

Сябры Бябеніна расказалі, што ўбачылі на месцы трагедыі самі.

Сябры Алега Бябеніна стрымалі слова. Прычакаўшы афіцыйнай версіі, яны расказалі пра тое, што ўбачылі на месцы трагедыі 3 верасня.

Блізкі сябар Бябеніна, інтэрнэтнік Фёдар Паўлючэнка быў у Пярхураве адным з першых.

«Цела ўжо ляжала на падлозе, і я папрасіў паказаць фота, на якім было бачна, дзе і як вісела цела, — кажа ён. — Алег вісеў на канаце ад гамака (канат з палец утоўшчкі), у куртцы, у чаравіках, куртка наглуха зашпіленая, пад нагамі ляжаў зэдлік з сагнутай ножкай. Алег упіраўся напаўсагнутымі нагамі ў падлогу. (...) Крыміналіст расшпіліў куртку, агледзеў кішэні і дастаў з задняй кішэні джынсаў некалькі буйных купюр беларускіх рублёў (каля 200—300 тыс. сінімі купюрамі па 50 тысяч). Больш нічога ў кішэнях не было, усе дакументы, дарагі тэлефон, ключы акуратна ляжалі на століку ў вялікім пакоі. У кніжцы чырвонага колеру (міжнароднае журналісцкае пасведчанне) ляжалі 400 даляраў. Версія рабавання і г.д. цалкам выключаная. Перадсмяротнай запіскі не было. Па словах крыміналіста, цела было яшчэ цёплым, і ён выказаў здагадку, што смерць наступіла ўсяго некалькі гадзінаў таму. Міліцыянты задралі швэдар, на целе спераду ніякіх бачных слядоў пашкоджанняў не было. Крыху пазней я заўважыў, што левая кісць і рукаво запэцканыя сажай, пры гэтым выразна быў бачны «ўдар» на костачцы сярэдняга пальца (гэта нават была хутчэй увагнутасць ад удару). Звяртала на сябе ўвагу правая ступня, якая была ненатуральна вывернутая направа пад вуглом амаль 90 градусаў».

Па словах Паўлючэнкі, у пакоях дома была ідэальная чысціня, на падлозе стаялі дзве пустыя паўлітровыя пляшкі ад «Беларускага бальзаму» і пустая чарка. І ні крошкі ежы.

Паўлючэнку моцна зачапіла асабістая дэталь: гэта ён прасіў Бябеніна пазычыць тыя 400 даляраў. І сустрэцца яны мелі 2 верасня а 20-й гадзіне. Але так і не сустрэліся. У той дзень Бябенін прапаў з сувязі.

**Сямён Печанко**

## «Можаш проста знікнуць ціхім вечарком»

Пра свае сумневы адносна высноваў следства напісаў ва ўласным блогу і драматург Мікалай Халезін. Услед за гэтым у яговым дзённіку з'явілася ананімная пагроза. Невядомы паабяцаў кіраўніку «Свабоднага тэатра», што таго могуць збіць у пад'ездзе, альбо ён можа проста знікнуць ці трапіць у аварыю.

Падобныя паведамленні атрымала і рэдактарка сайта charter97.org Наталля Радзіна. Паводле Радзінай, супрацоўнікам сайта пагражалі і раней. Цяпер пагрозы сталі прыходзіць штодзень. Журналістка кажа, што запалохванне мае адваротны эфект: «Працаваць мы ўсё роўна будзем, а падонкам рана ці позна давядзецца за ўсё адказаць».

**СП**

## Спачуванне «Звязды» і цынізм Зімоўскага

Дзяржаўныя СМІ паведамілі пра смерць Бябеніна на наступны дзень пасля пахавання журналіста.

Развітальнае слова ў «Звяздзе» напісала калега Алега Святлана Барысенка.

«Советская Белоруссия» падала нейтральны матэрыял пра смерць журналіста пад загалоўкам «Трагедыя на дачы».

А вось дзяржаўныя тэлежурналісты не ўтрымаліся, каб не праехацца па асобе памерлага і яго атачэння. Цынізмам адзначыўся допіс у блогу кіраўніка Белтэлерадыёкампаніі Аляксандра Зімоўскага: «Жыў-быў адзін чалавек. Пад Мінскам меў ён двухпавярховую дачу, цаніў дарагія напоі, адпачываў з сям'ёй у Грэцыі, вадзіў сяброўства з цікавымі людзьмі-спонсарамі. І вось знайшлі яго на гэтай самай дачы ў пятлі».

А тэлеканал АНТ у перадачы «Як ёсць» паставіў пад сумнеў вядомасць Бябеніна.

Сюжэты, прысвечаныя гібелі журналіста, паказалі расійскія каналы НТВ і РТР. У іх праводзілася думка пра датычнасць да здарэнння беларускай улады.

**СП**

### РЭАКЦЫІ

• **«Нейрадзюбель» памяці Бябеніна.** 4 верасня на фэсце «Рок па вакацыях» свой выступ лідар «Нейрадзюбеля» Аляксандр Кулінковіч прысвяціў Алегу Бябеніну і сказаў, што без удзелу журналіста не абыходзіліся запісы некалькіх апошніх «дзюбялёўскіх» альбомаў.

• **Кастусёў: адказнасць на ўладах.** Кандыдат у прэзідэнты ад Партыі БНФ Рыгор Кастусёў у сваёй заяве з нагоды Дня журналісцкай салідарнасці ўсклаў палітычную адказнасць за смерць журналіста Алега Бябеніна на беларускія ўлады.

# Кучма і Літвін фігуруюць у справе Гангадзэ

Раскрыты механізм палітычных забойстваў ва Украіне.

Праз дзесяць гадоў пасля забойства ўкраінскага журналіста Георгія Гангадзэ пракуратура вызначылася з першым заказчыкам злачынства. Гэта Юрый Краўчанка, тагачасны міністр унутраных справаў. Следства высветліла, што тагачасны кіраўнік Крымінальнага вышуку МУС генерал Аляксей Пукач атрымаў загад забіць Гангадзэ непасрэдна ад міністра.

7 верасня кіраўнік следчай групы вынес канчатковую пастанову аб прыцягненні Пукача да крымінальнай адказнасці. У дакуменце і апісаная роля Краўчанкі ў найбольш рэзанансным злачынстве незалежнай Украіны.

«Пукач А.П. 17 верасня 2000 г., выконваючы відавочна злачынны вусны загад міністра ўнутраных справаў Краўчанкі Ю.Ф., г.зн. на замову, па папярэдняй змове групай асобаў, сумесна з Пратасавым, Кастэнкам і Паповічам, якія не ведалі пра злачынны загад, наўмысна забіў Гангадзэ Г.Р.», — гаворыцца ў пастанове следчага.

Гангадзэ выкралі 16 верасня, але, па дадзеных следства, забойства адбылося ў 00.10 17 верасня. Пратасаў, Кастэнка і Паповіч — супрацоўнікі міліцэйскай службы вонкавага сачэння, якія за ўдзел у забойстве Гангадзэ атрымалі 12 і 13 гадоў турмы.

«Прыкладна 13—14 верасня 2000 у сваім службовым кабінеце міністр унутраных справаў Краўчанка Ю.Ф. вусна аддаў Пукачу А.П. відавочна злачынны загад — забіць журналіста Гангадзэ Г.Р. для спынення такім чынам журналісцкай дзейнасці, — гаворыцца ў пастанове. — Пукач А.П. ...не жадаючы ўскладняць адносіны з кіраўніком МУС Украіны, а таксама разлічваючы ...атрымаць падвышэнне па службе, пагадзіўся выканаць загад».

### Паслугі таксі

У абвінавачанні Пукача фігуруе эпізод выкрадання Аляксея Падольскага — памочніка аднаго з украінскіх апазіцыйных дэпутатаў.

Пукач і двое супрацоўнікаў службы вонкавага сачэння Навумец і Марыняк, якія пазней атрымалі па тры гады турмы, выкралі Падольскага. Адбылося гэта па той самай схеме, што і з Гангадзэ, — прапанаваўшы яму паслугі таксі.

Падольскага вывезлі ў лесапаласу каля вёскі Пятроўскае Чарнігаўскай вобласці. Збілі, без рэчаў і дакументаў пакінулі ноччу ў лесе і з'ехалі. Вярнуўшыся ў Кіеў, Пукач падпаліў дзверы кватэры, дзе жыў Падольскі, а на наступны дзень адрапартаваў Краўчанку аб «прафілактычных мерах», прынятых у дачыненні да грамадскага дзеяча.

### Вочная стаўка Пукач — Літвін

Журналістам сталі вядомыя паказанні Пукача ў дачыненні да спікера парламента Уладзіміра Літвіна. Паводле словаў генерала, пасля забойства Гангадзэ Літвін пабываў у кабінеце Краўчанкі. Яшчэ там прысутнічаў першы намеснік міністра Мікола Джыга, кіраўнік апарата МУС Эдуард Фэрэ і сам Пукач.

Як сцвярджае Пукач, Краўчанка асабіста прадставіў яго Літвіну са словамі: «Уладзімір Міхайлавіч, гэта наш супрацоўнік, які асабіста разабраўся з Гангадзэ». Пры гэтым Краўчанка паляпаў Пукача па плячы і звярнуўся да Літвіна са словамі: «Перадайце прэзідэнту, што мы выкапаем любое яго ўказанне».

Пасля гэтага, па словах Пукача, размова Краўчанкі і Літвіна праходзіла без сведак, а на наступны дзень Краўчанка загадаў Пукачу перапахаваць цела, аддзяліўшы ад яго галаву.



**Леанід Кучма і Юрый Краўчанка на адкрыцці ліцэя МУС у дзень выкрадання Гангадзэ. Кіеў, 16 верасня 2000 г.**

У хадайніцтвах да следчага Пукач ініцыяваў вочныя стаўкі з Літвінам і Джыгам. «Я з вамі незнаёмы», — адказаў Літвін Пукачу. Адпрэчваў версію Пукача і Мікола Джыга.

Таксама, паводле крыніц, на допытах Пукач паведаміў, што ў жніўні 2000 Джыга ўзяў у яго матэрыялы на Гангадзэ, сабраныя міліцыяй, і адвёз іх у аэрапорт «Барыспаль». Адтуль Краўчанка вылецеў да Кучмы, які адпачываў у Крыме.

Пукач настойвае, што пра злачынства было вядома і тагачаснаму кіраўніку СБУ Леаніду Дзеркачу. Па словах генерала, на наступны дзень пасля забойства Пукача наведаў памочнік Дзеркача па ўзаемадзеянні з МУС. Ён паведаміў, што яму вядома аб выкраданні журналіста.

Яшчэ Пукач сказаў на допытах, нібы Краўчанка неадназова яго пераконваў, што дамовіўся з Кучмам, і генерала з яго «эскадронам смерці» не крануць.

Каб прадэманстраваць шчырасць сваіх намераў супрацоўнічаць са следствам, Пукач паказаў, дзе быў пахаваны чэрап Гангадзэ. Побач з гэтым месцам былі знойдзеныя парэшткі яшчэ дванаццаці (!) чалавек.

### Душыў рэменем

Пукачу выстаўленае абвінавачанне па трох артыкулах Крымінальнага кодэкса: «Перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў, калі яно суправаджалася гвалтам, ужываннем зброі або дзеяннямі, што прыносілі боль і абражалі асабістую годнасць пацярпелага дзеяннямі, пры адсутнасці прыкмет катаванняў», «Перавышэнне ўлады або службовых паўнамоцтваў, калі яны пацягнулі цяжкія наступствы», «Наўмыснае забойства пры абцяжарвальных абставінах, здзейсненае па папярэдняй змове групай асоб або арганізаванай групай», а таксама «Наўмыснае забойства пры абцяжарвальных абставінах, здзейсненае на замову».

Максімальная санкцыя па гэтых артыкулах — пажыццёвае зняволенне.

Пукач сцвярджае, што, калі душыў Гангадзэ рэменем, хацеў толькі запалохаць журналіста, але не разлічыў сілу — і заснавальнік «Украінскай праўды» загінуў.

Гэта не зусім укладаецца ў логіку паказанняў трох саўдзельнікаў Пукача. Паводле іх, аўтамабіль, у якім знаходзіўся Георгій пасля выкрадання, па дарозе да месца злачынства заехаў у вёску Сухалесы Белацаркоўскага раёна. Там Пукач узяў вяроўку і рыдлёўку, якія паклаў у багажнік. Калі адштурхоўвацца ад версіі «запалохвання», гэты інвентар быў неабавязковым.

### Экс-міністр застрэліўся

Далей машына з Георгіем адправілася ў лес, які знаходзіцца непадалёк ад вёскі. Там Паповіч — кіроўца Пукача — выкапаў яму. Георгію звязалі вяроўкай рукі і ногі, а Пукач засунуў у рот хусцінку. Далей кіроўца Пукача зняў з Гангадзэ рэмень і перадаў генералу. Той накінуў пятлю на шыю журналісту і пачаў яго душыць. Георгій набраў паветра ў лёгкія, тады кіроўца Пукача некалькі разоў ударыў яго ў жывот, каб той выпусціў паветра.

Незалежна ад таго, наважыцца пракуратура ісці да яшчэ жывых верагодных замоўцаў ці не, яшчэ дзесяць гадоў таму з так званых «запісаў Мельнічэнкі» кожны мог зразумець, што насамрэч адбылося з Георгіем Гангадзэ.

Калі адзіным замоўцам забойства прызнаюць былога міністра ўнутраных справаў, то ў распачынанні справы супраць яго будзе адмоўлена ў сувязі са смерцю. Экс-міністр Краўчанка застрэліўся 5 гадоў таму, у 2005 годзе. Ён пакінуў перадсмяротную запіску, у якой вінавацціў у сваёй смерці экс-прэзідэнта Кучму і ягонае атачэнне. Гэта было гучнае самагубства: Краўчанка стрэліў сабе ў галаву двойчы, што дапускала версію забойства.

**КаМ; паводле pravda.com.ua**




## Дзень горада ў Мінску: размах і абсурды

11—12 верасня ён прайшоў з асаблівым размахам.

Адбыліся канцэрты. Моладзь магла пазмагацца ў розных спартовых забавах. Вуліцы старога горада сталі пешаходнымі. Адбыўся традыцыйны кірмаш рамёстваў.

Гістарычны антураж свята сёлета паходзіў з Расійскай імперыі. Асабліва тупа выглядалі **аперэтачныя гарадавыя ля Ратушы (на фота)**. Насамрэч акурат за царом Ратушу зруйнавалі як небяспечны сімвал беларускай вольнасці. Таму ніякія гарадавыя каля Ратушы стаяць не маглі.

**Мікола Бугай**

# Беларусь на дзіцячым «Еўрабачанні» будзе прадстаўляць сын баптысцкага пастара

Ён абхапіў мікрафон рукамі і гучна сказаў: «Уся слава Богу!»




Прадстаўніком Беларусі на VIII міжнародным дзіцячым конкурсе песні «Еўрабачанне-2010» стаў Данілка Казлоў з горада Жабінка, што ля Брэста. Канкурсанта выбіралі ў жывым эфіры Першага канала. Ён трансляваў фінальны адборачны канцэрт са студыі Белтэлерадыёкампаніі.

Журы і гледачы сышліся ў выбары. Песня «Музыкі святло» ў выкананні Данілы набрала найвышэйшую колькасць балаў — 24.

На другім радку — жыхарка сталіцы Эвеліна Лашук з «Дзядуліным хітом». Трэцюю пазіцыю заняла Юлія Атрошчанка з песняй «Купала» (Мазыр).

Дзіцячае «Еўрабачанне» пройдзе 20 лістапада ў Мінску.

Цікава, што Даніла Казлоў — сын баптысцкага пастара. Так супала, што летась за Беларусь таксама спяваў хлопчык з пратэстанцкай сям'і. «Чароўны трусік» Юрася Дзямідовіча не перамог, але стаў папулярнай песняй, што зачапіла дарослую аўдыторыю.

На сёлетнім адборы Даніла Казлоў быў акуратна і з густам апрануты. Ягоная група падтрымкі складалася толькі з аднаго хлопца, які падыгрываў на клавішах. Даніла спяваў пра чысціню, нябёсы, сэрца. І калі вядучыя падышлі да хлопчыка, трохі збянтэжанага сваім пераможным выступам, ён абхапіў мікрафон рукамі і гучна сказаў: «Уся слава Богу!»

**Мікола Бугай**

# Помнік Хрысту на рагу Камуністычнай

Да Дажынак у Лідзе будуюць помнік у гонар 2000-годдзя Нараджэння Хрыстовага. Новы аб'ект устае на рагу вуліц Машэрава і Камуністычнай. Два дзясяткі лідчукоў, здзіўленых такім спалучэннем, звярнуліся з адкрытым лістом да праваслаўнага епіскапа Навагрудскага і Лідскага Гурыя і каталіцкага біскупа Гродзенскага Аляксандра Кашкевіча, а таксама старшыні Лідскага райсавета Уладзіміра Цімчанкі.

«Мы, хрысціяне-вернікі, успрымаем гэта з агідай і як блюзнерства. Як нельга памірыць агонь з вадой, дэмакратыю з камуністычным таталітарызмам, так яшчэ больш нельга памірыць веру ў Бога з камунізмам». Далей у сваім лісце жыхары Ліды прыгадваюць страшныя старонкі гісторыі, калі ад рук саветаў загінулі мільёны нявінных людзей, у тым ліку тысячы святароў.

«І вось у Лідзе на вуліцы, якая названа ў гонар гэтых нелюдзяў, устанаўліваецца помнік Ісусу Хрысту. Якое горшае пасмешышча можна прыдумаць!?»

Жыхары горада просяць іерархаў не браць удзелу ў «грэшнай імпрэзе» адкрыцця помніка. Да той пары, пакуль вуліца не зменіць назоў.

Старшыня райсавета адказаў аператыўна: «Прапануем вам звярнуцца ў тапанімічную камісію пры раённым выканаўчым камітэце».

**Настасся Шамрэй**




# Вольскаму — 45!

Стваральніку ўласнай «Мроі»,

сябру ўрада N.R.M.,

народнаму аўтару, а як дакладней сказаць, суаўтару «Народнага альбома»,

прыхільніку святых вечароў падчас мілeніума,

аднаму з «Народжаных тут»,

папулярызатару старажытнай маркі «Крамбамбуля» (а асабліва «Крамбамбуля Агнявая»),

шчыраму аматару апошняй літары ў алфавіце, літары ZET,

а таксама музычнаму страсальніку «Белай яблыні грому»,

а таксама ўласнаручнаму творцу ўсебеларускага брэнда «Проста Лявон Вольскі»©,

спадару Лявону Вольскаму — 45!

Рэдакцыя «Нашай Нівы» віншуе спадара Лявона з днём народзінаў і зычыць плёну!

## Здарэнні

• **Мыла вокны і звалілася з дзясятага паверха.** Жанчына 1941 года нараджэння жыла на праспекце Пераможцаў. Каб дастаць да верху акна, яна паставіла адну табурэтку на другую. Але канструкцыя аказалася нямоцнай, і жанчына звалілася ўніз. Яна загінула.

• **Камбайн адрэзаў ногі.** Беспрацоўная жанчына 1956 года нараджэння засталася без ног, трапіўшы пад камбайн на кукурузным полі пад Салігорскам. Яна рвала кукурузу і не заўважыла камбайн. Жняяркай ёй струшчыла галёнкі, іх ампутавалі ў бальніцы. А ў вёсцы Шамава на Мсціслаўшчыне 29-гадовы мужчына загінуў пад плугам. Араў поле і ўпаў. Конь, што быў запрэжаны ў плуг, нечага спудзіўся і пабег. Спрабуючы яго спыніць, чалавек атрымаў траўму брушной поласці і памёр.

• **Маладая мама дадала ў малочную сумесь гарэлку — дзіця памерла.** 18-гадовая маці, жыхарка адной з вёсак Брэсцкай вобласці, дадала ў малочную сумесь для кармлення трохмесячнай дачкі 10 грамаў гарэлкі. Дзіця памерла ад атручэння спіртам. У дачыненні да маці распачатая крымінальная справа за прычыненне смерці па неасцярожнасці. Паводле слоў маці, яна думала, што ў яе дзяўчынкі глісты, і хацела палячыць дзіця такім народным спосабам, пра які недзе чула.

• **У выніку сутыкнення маршруткі і легкавіка ў Мінску пацярпелі шэсць чалавек.** Аварыя адбылася на скрыжаванні Арлоўскай і Карастаянавай. Са словаў відавочцаў, кіроўца маршруткі рухаўся на чырвоны сігнал святлафора. У выніку сутыкнення маршрутка перакулілася. У аварыі пацярпелі шэсць чалавек.

• **Міліцыя затрымала найбуйнейшую ў гісторыі краіны партыю гераіну.** 39-гадовы жыхар Магілёва быў затрыманы ў пункце збірання дарожных пошлін «Рэдзькі» на аўтадарозе Брэст — Масква. У аўтамабілі «Опель-Астра» з расійскім рэгістрацыйным знакам наркакур'ер перавозіў 28 кг гераіну — самую буйную партыю наркотыкаў у гісторыі Беларусі. У бакавых панэлях задняга пасажырскага сядзення міліцыянеры знайшлі 187 пакункаў круглай формы, замаскаваных пад цыбулю. У іх была герметычна спрасаваная маса шэрага колеру — гераін на мільён даляраў. Ідзе следства.

• **Сталічнага камунальніка злавілі на хабары.** Распачатая справа ў дачыненні да службовай асобы аднаго з аддзелаў ДВА «Камунальная гаспадарка Мінгарвыканкама». Чыноўніка затрымалі пасля атрымання ім хабару ў 7 тыс. даляраў ад прадстаўніка прыватнай фірмы. Хабар прызначаўся за спрыяльнае вырашэнне пытання аб даванні ў арэнду памяшкання па мінімальнай стаўцы аплаты.

• **Шторм у Крыме выкінуў на бераг целы беларуса і беларускі.** 11 верасня шторм выкінуў на бераг паблізу Ялты целы патанулых у Чорным моры людзей. Сярод іх і 63-гадовы жыхар Мінска. Назаўтра на ўзбярэжжы знайшлі цела жыхаркі Гомеля 1974 года нараджэння. Жанчына з мужам фатаграфавалася на беразе, і яе змыла ў мора хваляй. Моцны шторм на Чорным моры прывёў да шматлікіх чалавечых ахвяраў.

**СМ; БелаПАН**

Хамскія дзеянні міліцыі адбіваюць у людзей ахвоту наведваць стадыёны. Піша **Зміцер Панкавец**.

# «Міліцыянер папрасіў расшпіліць шырынку»

Здавалася б, пасля сенсацыйнай перамогі нашых хлопцаў у Парыжы стадыён павінен быў трашчаць ад перапоўненасці. Але нічога падобнага не назіралася. На «Дынама» было дастаткова вольных месцаў.

Прызнацца, жаданні садзіцца на брудныя крэслы стадыёна становіцца ўсё менш. Дзе павага нашай федэрацыі да заўзятараў?

Чаму пасля наведвання матча мусова трэба праць вопратку? Няўжо так цяжка вымыць гэтыя крэслы?

Газеты браць з сабой забараняюць — іх можна падпаліць, кажа міліцыя. Некаторыя вынаходнікі хавалі абрыўкі прэсы, прабачце, сабе ў майткі. Толькі так удавалася пранесці. Праўда, гэтым разам пры ўваходзе раздавалі невялічкія пакеты. І тое плюс.

А найбольшы мінус — пільны нагляд пры ўваходзе. Міліцыянт углядаецца ў кожны шалік. Каб, не дай Бог, не было Пагоні. Шлях на трыбуны ляжыць праз тры кардоны міліцыі.

Гэтым разам прасілі паказаць нават майкі, бо ў зялёных на стадыён збіраліся прайсці актывісты «Гавары праўду». Адзін заўзятар на сайце pressball.by прызнаўся, што міліцыянт нават папрасіў расшпіліць шырынку ў джынсах. Што таемнага можна пранесці там? Калі заўзятар запытаўся, ці мае міліцыянт на гэта правы, то адказ быў: «Я маю правы цябе не пускаць на стадыён».

Агулам надгляд заўзятараў займае паўгадзіны-гадзіну. Трэба адстаяць у вялізных чэргах. На матч з румынамі балельшчыкаў заклікалі прыйсці за дзве гадзіны да гульні! Але прапускныя пункты адчынілі толькі за гадзіну і дваццаць хвілін да пачатку... І што, хтосьці пойдзе так мучыцца з 10-гадовым сынам, напрыклад?

Кажуць, што правяраюць шкарпэткі, бо ў іх можна пранесці нож. Ежу таксама не дазваляюць браць.

«Пайшоў з дзецьмі, у малодшага ў кішэні было некалькі бутэрбродаў. Дасталі іх і выкінулі ў сметніцу. Я кажу, каб паказаў, дзе напісана, што з бутэрбродамі нельга на сектар. Мент адказвае, што зараз усё кіне і пойдзе табе шукаць пастанову. Я кажу, каб назваў прозвішча. Іваноў, задавальняе?» Гэта тыповы заўзятарскі допіс на форуме пасля гульні.



І як змагацца з такім безапеляцыйным хамствам? Калі ісці шукаць начальніка гэтага міліцыянта, можна прапусціць увесь матч, а білеты досыць дарагія, не хочацца іх губляць.

Частка заўзятараў прапаноўвае абвясціць байкот, не хадзіць на стадыён, а назіраць за гульнямі па тэлебачанні. Іншыя рыхтуюць зварот у вышэйшыя інстанцыі.

Асабліва наш прапускны рэжым кантраставаў з французскім. Там проста на трыбунах прадаецца віно і піва. І людзі ходзяць туды, як на адпачынак.

На сайце «Прессбола» вісіць галасаванка адносна працы міліцыянтаў на матчы. 40% апытаных адказалі, што яна была «грубай і прыніжальнай».

Калі так пойдзе далей, то на кастрычніцкі матч зборнай з Албаніяй жадаючых трапіць на стадыён яшчэ зменшыцца. Хоць зборная і згуляла ўнічыю з румынамі, і цяпер узначальвае нашу адборачную групу.

# Копія веры

Піша **Віталь Тарас**.

14 верасня каталіцкі свет адзначае свята Узвышэння Жыватворнага Крыжа (Узвіжанне). Свята было ўсталявана 1665 гадоў таму ў сувязі з асвячэннем у Ерусаліме храма Уваскрасення Хрыста. Ён быў узведзены ў гонар важнай падзеі: у Палесціне падчас раскопак, якія арганізавала маці імператара Канстанціна Вялікага, знайшлі пячору Магілы Ісуса Хрыста, а блізу яе — тры крыжы...

Сёлета Узвіжанню папярэднічалі трагічныя падзеі.

У індыйскім Кашміры натоўп спаліў хрысціянскую місіянерскую школу, а ў суседнім штаце Пенджаб — царкву. Загінулі шаснаццаць чалавек, дзясяткі параненыя. (Паводле збегу акалічнасцяў, у гэтыя дні з візітам у Індыі быў біскуп з Беларусі Уладзіслаў Блін, які сустрэўся з тамтэйшымі каталікамі.)

Напярэдадні ў Афганістане ахвярамі закалотаў сталі два чалавекі. Такім быў адказ на спаленне копіяў Карана ў ЗША. Святар-евангеліст Тэры Джонса збіраўся публічна спаліць Каран на знак пратэсту супраць планаў збудаваць мусульманскі культурны цэнтр і мячэць ля разбураных тэрактам 11 верасня 2001 г. вежаў Усясветнага гандлёвага цэнтра ў Нью-Ёрку.

Джонса асудзілі ўсе рэлігійныя канфесіі ў свеце, і ён адмовіўся ад сваіх планаў. Але ў гадавіну тэрактаў двое нейкіх святароў спалілі «копіі Карана» (як было сказана ў інфармацыйных паведамленнях) паблізу горада Нэшвіл. А ў Нью-Ёрку падчас жалобных цырымоній адзін з дэманстрантаў вырваў некалькі старонак са святой кнігі мусульман.

Уразіла слова «копіі». Што гэта азначае — спаленыя асобнікі не былі асвечаныя мусульманскімі святарамі? Ці гэта была кніга з пустымі старонкамі пад вокладкай Карана? А ці можна ўявіць сабе копію крыжа альбо паўмесяца? Ды хіба наогул можна ўявіць, каб людзі беспакарана здзекаваліся з «копіяў»? Проста паліць кнігі — ужо ёсць грэхам і злачынствам (гэтым займаліся нацысты ў гітлераўскай Германіі). Знішчаць ці апаганьваць кнігі, якія з'яўляюцца сімвалам веры, — падвойнае злачынства.

Разважаць, рабіць маральны выбар і прадбачыць яго вынікі — абавязак кожнага чалавека. І ён не залежыць ад колеру скуры, нацыянальнасці або веры. А інакш паліткарэктнасць абарочваецца карыкатурай на этыку. Не можа быць асобных нормаў паводзінаў для неграў, індзейцаў, пратэстантаў, юдэяў, імігрантаў, геяў і ўсіх астатніх толькі таму, што яны складаюць меншасць ці іх продкі былі ахвярамі дыскрымінацыі альбо гістарычнай несправядлівасці. Такі падыход прыніжае годнасць чалавека.

Адваротны бок паліткарэктнасці — крывадушнасць. Злучаныя Штаты і Еўрасаюз віталі вынікі нядзельнага рэферэндуму ў Турцыі, большасць удзельнікаў якога сказалі «так» зменам у Канстытуцыі. Фармальна змены стануць крокам да еўрапейскай дэмакратыі: больш незалежныя суды, больш правоў у жанчын і дзяцей і, галоўнае, меншая роля войска. Войска перастане быць гарантам свецкага характару турэцкай дзяржавы. Але ў сапраўднасці вынікі рэферэндуму мацуюць уладу панучай партыі Эрдагана. Партыі, якая праводзіць палітыку ісламізацыі, спрабуе вярнуць дзяржаву ў часы да Атацюрка — да Асманскай імперыі. Адным з відавочных вынікаў такой палітыкі ўжо стала рэзкае пагаршэнне турэцка-ізраільскіх адносінаў.

Не варта казаць пра нейкае лёсавызначальнае супрацьстаянне паміж аўрамічнай (юдэа-хрысціянскай) і мусульманскай рэлігіямі.

Аятала Хамейні па сваім вяртанні ў Іран у выніку рэвалюцыі 1979 года ўступіў у жорсткае супрацьстаянне не толькі з ЗША і Еўропай. 22 верасня споўніцца трыццаць гадоў з пачатку Ірана-іракскай вайны, якая працягвалася да жніўня 1988 года і скончылася нічым. Сёння мала хто ўспамінае тую вайну, якая стала адным з самых крывавых канфліктаў XX стагоддзя. Абедзве краіны страцілі забітымі каля 900 тысяч чалавек. Захад тады падтрымліваў лідара Ірака Садама Хусейна, якога лічыў «меншым злом». Іронія гісторыі. І «суніцкі» Ірак, і «шыіцкі» Іран падчас вайны неаднойчы выкарыстоўвалі хімічную зброю, забароненую міжнароднымі канвенцыямі. Іранскіх жаўнераў — часта зусім падлеткаў — выхоўвалі ў духу рэлігійнага фанатызму. Гэта іх нашчадкі кіруюць сёння ў Тэгеране.

Ніхто не ведае, як слова наша адгукнецца? Але палітыкі, як і святары, павінны ведаць. І адказваць за свае словы. Бо іх цана — не копія, але сапраўдная чалавечая кроў.

ДАСЛОЎНА

## РІА «Новости»: Беларуская апазіцыя абяцае Расіі «перазагрузку адносінаў»

Апазіцыйныя кандыдаты ў прэзідэнты Беларусі гатовыя прапанаваць Расеі новы сцэнар развіцця двухбаковых адносінаў, заснаваны на добрасуседстве і прагматызме, перадае РІА «Новости».

«На постсавецкай прасторы з'явілася цікавая мадэль, прадстаўленая Віктарам Януковічам. Ён абвяшчае рух у Еўрасаюз, дэманструючы імгненнае паляпшэнне адносінаў з Расеяй», — сказаў у інтэрв'ю РІА «Новости» Андрэй Саннікаў, лідар грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь», які заявіў пра свой удзел у прэзідэнцкай кампаніі.

«Раней заўсёды здавалася, што Расея зацікаўленая ў тым, каб у Беларусі была дыктатура. Аднак Лукашэнка, які вымантачвае грошы пад пустыя абяцанні, у якасці партнёра сёння не задавальняе нікога», — лічыць Саннікаў.

З ПОШТЫ РЭДАКЦЫІ

## Як бы мы ні ставіліся да Лукашэнкі

Як бы мы ні ставіліся да Лукашэнкі, але Расія не мае права абліваць яго брудам, усяляк абражаць. Які ён ёсць, гэта мы ведаем самі. Я не ўхваляю шмат чаго, што робіць наша ўлада. Усе мы ведаем пра зніклых палітыкаў, пра палітзняволеных... Але ж чаму расійскія імперыялісты толькі цяпер гэта ўбачылі? Дзе яны былі раней? Цяпер яны здымаюць фільмы «Хросны Бацька»...

Лукашэнка з'яўляецца дзейным прэзідэнтам, і ўвесь гэты бруд, гэтая абраза, няхай там ёсць і доля праўды, і ўся праўда — гэта абраза не толькі адной асобы, але і абраза Беларусі.

**Сяргей Ціханавец, Бягомль (Віцебская вобласць)**


## Стыпендыяльная праграма міністра культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча «Gaude Polonia»

Нацыянальны цэнтр культуры аб'яўляе конкурс на атрыманне стыпендыі на шасцімесячны курс навучання ў Польшчы ў рамках стыпендыяльнай праграмы міністра культуры і нацыянальнай спадчыны Рэспублікі Польшча «Gaude Polonia». Праграма «Gaude Polonia» прызначаецца для маладых дзеячаў культуры і перакладчыкаў з краін Цэнтральнай і Усходняй Еўропы.

Курс навучання ў Польшчы пачнецца 1 лютага і будзе доўжыцца да 31 ліпеня 2011 года. Набор удзельнікаў ажыццяўляецца на конкурснай аснове. Кандыдаты павінны валодаць польскай мовай на базавым узроўні.

Заяўкі прымаюцца да 15 кастрычніка 2010 года.

Падрабязную інфармацыю аб праграме і бланкі анкет можна атрымаць на інтэрнэт-старонцы www.nck.pl/kategoria/234/gaude-polonia/pr/true, а таксама ў польскіх дыпламатычных прадстаўніцтвах у Мінску і ў Нацыянальным цэнтры культуры ў Варшаве (т.: +48 22 210 01 21).

# «У гасцях у кандыдата»: Рыгор Кастусёў



Піша **Настасся Зелянкова**, фота **Юліі Дарашкевіч**.

Візіт да Рыгора Кастусёва ў рамках праекта «У гасцях у кандыдата» фатографа «Нашай Нівы» Юліі Дарашкевіч і журналісткі «Салідарнасці» Анастасіі Зелянковой ледзь не каштаваў адной з нас сямейнага шчасця. Затое мы даведаліся, у чым кандыдат ад БНФ можа даць фору Уладзіміру Някляеву, чым ён падобны да Аляксандра Лукашэнкі і чаму яго жонка не хоча, каб ён стаў прэзідэнтам.

— Вядома, прыязджайце, — гасцінна запрасіў нас Кастусёў, пачуўшы пра наш праект. — Давайце не ў гарадскую кватэру, а да нас у вёску. Мы лазню зацеплім, бліноў напячэм. Можаце і пераначаваць у нас.

Перспектыва вымалёўвалася прывабная: не кожны дзень выпадае магчымасць атрымаць кадры кандыдата ў лазні. Але ...

— У лазню, кажаш? Ну-ну... — нервова засоп мой муж і з'едліва дадаў: — Глядзі, даходзішся да сваіх кандыдатаў, што і вяртацца не будзе куды.

Ідэю з лазняй давялося пахаваць, ахвяраваўшы журналісцкім прафесіяналізмам дзеля сямейнага шчасця.

Пакуль ехалі да Кастусёва ў вёску Цяхцін, што ў Бялыніцкім раёне, размаўлялі. Улічваючы, што дарога няблізкая, да канца шляху мы ведалі пра кандыдата ўсё. Шмат з яго біяграфіі здавалася нейкім вельмі знаёмым: і былы дырэктар саўгаса, і з-пад Шклова...

— Дарэчы, вось тут, дзе пачатак Магілёўскай вобласці, пачынаўся і саўгас «Іскра», якім кіраваў Кастусёў, — расказвае наш гід, старшыня Партыі БНФ Аляксей Янукевіч. — Паміж іншым, тады гэта было адзінае на ўсёй трасе месца, дзе стаяў указальнік на беларускай мове.

## Шклоўскі бацька

Гаспадар сустрэў нас проста на вуліцы. Побач круціўся малы белы сабачка. Як пазней высветлілася, ён і яшчэ двое катоў і складалі ўсю гаспадарку кандыдата.

— Гэта дом яшчэ майго дзеда, — паказваў нам радавое гняздо Кастусёў. — Тут я нарадзіўся. Прычым у наўпростым сэнсе: «хуткая» не паспела даехаць — дарогі тады горшыя былі. Цяпер мы ў асноўным жывём тут толькі летам. А так у Магілёве ці ў цешчы ў Шклове.

Экскурсію па падворку нам абяцалі адразу пасля бліноў, таму мы паспяшаліся ў дом. Пераступіўшы парог, мы застылі, прыгаломшаныя: ля печы спрытна завіхалася жонка кандыдата (я, шчыра кажучы, нават і не думала, што нехта яшчэ гатуе ў печы). А бліны ў яе — тоўстыя, духмяныя!

## Пазнаёміліся на вяселлі

Мы пазнаёміліся. Аказалася, спадарыня Людміла нарадзілася на Гродзеншчыне, аднак усё жыццё пражыла на Магілёўшчыне. Працавала выхавацелькай у дзіцячым садку. А пазнаёміліся яны з будучым мужам тут, у Цяхціне, куды Людміла прыехала на вяселле да сваяка. У выніку — трыццаць гадоў шчаслівага сямейнага жыцця і трое цудоўных дзяцей — дзве дачкі і сын.

— Я і чацвёртага гатовая была нарадзіць, ды Грыша вырашыў, што хопіць, — смяецца спадарыня Людміла. — Хоць калі б я яго слухала, дык і гэтых не было б. Вечна яму на месцы не сядзіцца... Не, нельга яму быць прэзідэнтам. У яго за ўсё душа баліць. Усюды яму разабрацца трэба. А я тут сядзі сабе адна, як Галіна Лукашэнка.

— Няўжо зусім не сварыцеся? — усё не верылі мы, слухаючы, з якой любоўю гаворыць Людміла пра мужа.

— Ой, яшчэ як бадаемся, — смяецца жонка і з задавальненнем дадае: — Затое як потым салодка мірыцца!

Тое, што Кастусёў — сем'янін прыкладны, мы асабліва і не сумняваліся.

— Бывае, выязджаем куды — усе гуляць ідуць у вольны час, а Кастусёў па крамах: жонцы і дзецям падарункі купляць, — расказаў потым Аляксей Янукевіч. — Ці вунь у Амстэрдаме былі. Дык усе з цікаўнасці выправіліся на экскурсію ў квартал «чырвоных ліхтароў», а Кастусёў махнуў рукой і пайшоў ў музей Ван Гога.

Яно і правільна, бо гаспадыня ў Кастусёва выдатная. Адны яе бліны з мачанкай чаго вартыя!

Неўзабаве на стол падалі і іншыя далікатэсы: перац з грады, марынаваныя баравікі.

— А гэтыя грыбы мы ўчора збіралі, — пахваліўся Рыгор Андрэевіч. — Я восемдзесят баравікоў знайшоў, і жонка столькі ж! Месцы



Гаспадар сустрэў нас проста на вуліцы сваёй роднай вёскі.



Сабака Бам — верны спадарожнік кандыдата.



Бліны ў спадарыні Людмілы тоўстыя, духмяныя.



Неўзабаве на стол падалі і іншыя далікатэсы: перац з грады, марынаваныя баравікі.

ведаю добрыя. Вы да нас наступным разам на даўжэй у госці прыязджайце. У грыбы сходзім, лазню зацеплім.

## Каліфарнійскія чарвякі для кампаставай ямы

Толькі накарміўшы да адвалу, кандыдат павёў нас на экскурсію па сваіх уладаннях. Перш за ўсё зазірнулі ў тую самую лазню.

Мяркуючы па аповедах, Кастусёў — лазеншчык выдатны.

—Мы неяк смяяліся, што трэба ўсіх нашых кандыдатаў у лазню загнаць: хто даўжэй выседзіць — адзіны, — згадвае Аляксей Янукевіч. — Някляеў, кажуць, таксама рэгулярна ў лазню ходзіць, але наш кандыдат дасць яму фору.

Вывучылі гарод, даведаліся пра каліфарнійскіх чарвякоў, якіх Кастусёў прывёз спецыяльна для кампаставай ямы, атрымалі кансультацыю, на якіх дровах лепш за ўсё смажыць шашлыкі, зазірнулі ў сад. Нават сабака Бам — верны спадарожнік кандыдата — з задавальненнем пагрыз з намі яблычак.

А запасы Кастусёва на зіму наогул вартыя асобнай размовы.

—Мы тут і вайну пратрымаемся, — смяецца Людміла.

## Зладзеяў адганяе

Пра вайну ў Цяхціне не думаюць, затое пра выбары пачалі пагаворваць. Пра тое, што іх зямляк хоча пазмагацца за прэзідэнцкі фатэль, аднавяскоўцы ведаюць. Вось толькі не асабліва вераць у перамогу. Не, у тым, што Кастусёў — чалавек добры і гаспадарлівы, тут ніхто не сумняваецца. Проста пра тое, як у краіне праходзяць выбары, у Цяхціне ведаюць не па чутках. У свой час Кастусёў ужо быў кандыдатам у мясцовыя саветы.

—Сусед усё абураўся: «Як так? Я ж усёй сям'ёй за цябе галасаваў. А табе толькі тры галасы напісалі. А нас жа чацвёра!»

Дарэчы, з тых часоў у доме ў кандыдата вісіць у рамачцы яго перадвыбарчы плакат.

—Вы не думайце, гэта не я, гэта мая мама павесіла, — сціпла заўважае Рыгор Андрэевіч. — Сказала, каб не здымалі. Так вось і вісіць на самым бачным месцы.

> «У Амстэрдаме ўсе пайшлі ў квартал «чырвоных ліхтароў», а Кастусёў — у музей Ван Гога».

—Ага, злодзеяў адганяе, — засмяялася жонка. — Залезе хто ў дом, зірне і спалохаецца.

Гэта не адзіная агітацыя за Кастусёва, да якой асабіста ён не мае ніякага дачынення.

—Нядаўна ў інтэрнэце сябры знайшлі і мне даслалі, — дэманструе кандыдат на ноўтбуку плакат, дзе гаўрошы распісваюць сцяну надпісам «Кастусёў». Крэатыў яшчэ той.

Памятае Рыгор Андрэевіч і выбары 1994 года. Тады ён асабіста ўгаварыў сваю маму прагаласаваць за Пазняка.

—Уся вёска галасавала за Лукашэнку, а мама — за Зянона. Яна потым нават неяк камплексавала. Затое, калі Лукашэнка ўвёў падатак на дом, уся вёска яго кляла. А мама хадзіла з такім гонарам, ажно свяцілася: «Трэба ведаць, за каго галасаваць!»

## «Парадак навядзе»

Аглядаючы дом, мы нечакана заўважылі на шафе гармонік. Сумеснымі намаганнямі прымусілі кандыдата ўзяць інструмент у рукі. Аднак спяваць Кастусёў катэгарычна адмовіўся.

—Вы самі паспявайце, а я вам падыграю, — аднекваўся Рыгор Андрэевіч. — Я ўжо столькі гадоў яго ў рукі не браў. Мне гэты гармонік яшчэ бацька купіў, калі я ў школе вучыўся.

Як высветлілася, спецыяльных музычных установаў кандыдат не скончаў. Усё, што ўмее, — вынік уласнай працы. І хоць ніколі нават нотнай граматы не ведаў, на вяселлях заўсёды быў выдатны музыка.

—Ён у мяне яшчэ і вершы піша, — хваліцца талентамі мужа жонка. — А калі прэзідэнтам стане — дык, нават не сумнявайцеся, парадак навядзе.

Ніхто і не думаў сумнявацца.

На дарожку нас напаілі гарбатай з цукеркамі — калі так далей пойдзе, то да канца праекта нам дакладна давядзецца сесці на найстражэйшую дыету — і далі з сабой гасцінцаў: яблыкі, бліны, вясковае малако.

—Паабяцайце, што яшчэ прыедзеце, — гасцінна запрашалі нас гаспадары.

Мы і не думалі аднекваццa.




Партрэт Кастусёва ў хаце павесіла ягоная мама.



Гэты гармонік Кастусёву яшчэ бацька купіў.



Трыццаць гадоў шчаслівага сямейнага жыцця і трое цудоўных дзяцей — дзве дачкі і сын. Фота з архіва.

# Няпросты кампраміс прафесара Астроўскага

**Карэспандэнты «НН» правялі адзін дзень з сям’ёй выкладчыка гродзенскага Медуніверсітэта, які адстаяў права сваёй дачкі навучацца па–беларуску.**

2 верасня пад вокнамі Гродзенскага гарвыканкама з’явілася група людзей з плакатамі. Прафесар **Алесь Астроўскі (на фота справа)** з жонкай Аксанай і дзецьмі, а таксама журналіст Уладзімір Хільмановіч прыйшлі патрабаваць адкрыцця ў Гродне беларускага класа. Пікетоўцаў прынялі ў гарвыканкаме і паабяцалі паспрыяць. А пасля гэтага іх усіх затрымалі міліцыянты і адвезлі ў пастарунак. У хуткім часе дарослых чакае суд. Аднак гэта не адзіны вынік іх адчайнага ўчынку. Света Астроўская будзе вучыцца па-беларуску.

## Апошняя беларускамоўная школа Гродна

У пятніцу 10 верасня карэспандэнты «НН» накіраваліся ў Гродна, дзе ў школе №32 мелася адбыцца сустрэча Астроўскіх і Хільмановіча з дырэктарам і загадчыкам аддзела адукацыі Ленінскага раёна. Перад гэтым прафесар з сябрамі гродзенскага Таварыства беларускай мовы тыдзень агітаваў па мясцовых школах на бацькоўскіх сходах за стварэнне беларускамоўнага класа. На пятнічнай сустрэчы мусілі падвесці вынікі тых сходаў ды даць адказ, будзе клас ці не.

32-я школа месціцца ў мікрараёне «Дзевятоўка». Стандартны шэра-блакітны будынак яе выдатна маскіруецца сярод жылога масіву тых жа колераў. Такі сабе кантраст з дыхтоўным будынкам польскай школы праз дарогу, якая разам з мадэрновым касцёлам з чырвонай цэглы ўтварае пасярод Дзевятоўкі выспу польскасці.

Уваход у школу вітае надпісам па-беларуску. У вестыбюлі першым у вочы кідаецца пано з выявамі беларускіх асветнікаў. Слова «асветнікі» напісанае класічным правапісам.

Чакаючы ў кабінеце дырэктара школы чыноўніка з аддзела адукацыі, робімся сведкамі дыскусіі паміж бацькамі і настаўнікамі. Прафесар Астроўскі загаварыў пра ненармальнасць моўнай сітуацыі ў Беларусі, у Гродне. «Нават у Эстоніі пачалі вучыць па-беларуску, у Латвіі школе дапамаглі», — кажа ён.

«Ды чулі мы пра гэта», — у адзін голас адказалі настаўнікі. Завуч, якая выкладае гісторыю Беларусі па-беларуску, гне сваё: «Мы ўсё разумеем, але сёння дыскутаваць не будзем. Сёння будзе вырашацца праблема канкрэтнай асобы».

Яна прыгадала 1991 год, калі таксама збіралі подпісы за беларускія класы. Бацькі ўпіраліся, і многіх скарыла абяцанне наладзіць у беларускамоўных класах паглыбленае вывучэнне англійскай мовы. «Наша школа апошняя ў горадзе, дзе быў набор у беларускамоўныя класы», — канстатавала завуч.

## «На вуліцы амаль не чуваць нашай мовы»

На час перамоваў з бацькамі загадчык аддзела адукацыі Сяргей Ламека папрасіў нас выйсці, паабяцаўшы пракаментаваць вынікі сустрэчы па яе сканчэнні. Сваё слова ён стрымаў.

Па яго словах, напрыканцы жніўня ў аддзел адукацыі паступілі дзве заявы ад бацькоў з просьбай арганізаваць для іх дзяцей беларускамоўны клас. Гэта пры тым, што бацькоў пачалі агітаваць яшчэ вясной. Дзвюх заяў было недастаткова, таму бацькам прапанавалі дадатковы час на агітацыю па школах. Вынікаў нуль, таму сем’ям Астроўскіх і Хільмановічаў прапанавалі кампрамісны варыянт — індывідуальнае вывучэнне большасці прадметаў па-беларуску. Астроўскія пагадзіліся.

Рэшту заняткаў іх дачка будзе наведваць разам з іншымі дзецьмі. Чыноўнік запэўніў, што аддзел адукацыі робіць усё магчымае для таго, каб дзеці вучыліся па-беларуску. У раёне дзейнічае некалькі беларускамоўных садкоў, бацькоў рэгулярна агітуюць пісаць заявы на стварэнне беларускіх класаў. Чаму іх па-ранейшаму няма? «Гэта праблема сацыяльнага характару. Прайдзіцеся па вуліцы. Там амаль не чутно нашай мовы».

## «Бо яна прыгожая»

У вестыбюлі відэаапаратара сайта «Нашай Нівы» абступілі дзеці. Усім хочацца трапіць у кадр. Імправізаванае апытанне паказала, што вучыцца па-беларуску хочуць адны дзяўчаткі. Сярод хлапчукоў ахвочыя знайшліся толькі на школьным двары. На пытанне, навошта трэба вучыцца па-беларуску і якая яна, беларуская мова, двое сяброў адказалі: «Бо яна прыгожая». Яны запэўнілі, што добра разумеюць мову, падмацаваўшы гэта некалькімі сказамі па-беларуску. За інтэрв’ю з вокнаў школьных кабінетаў назіралі іншыя дзеці.

Апытанне на вуліцы Савецкай выявіла некалькіх бацькоў, якія хацелі б аддаць сваіх дзяцей у беларускамоўны клас, але з нейкіх прычын не змаглі гэтага зрабіць. Свае сімпатыі да мовы выказвалі і маладыя людзі, для якіх свае дзеці яшчэ ў планах. І толькі адна жанчына катэгарычна заявіла, што будзе вучыць сваё дзіця выключна па-расійску.

## Беларусізацыю трэба пачынаць з універсітэтаў

Астроўскія жывуць у нядаўна збудаваным квартале Дзевятоўкі. Як шматдзетная сям’я яны атрымалі льготны крэдыт на новую двухпакаёўку. На іхнім пад’ездзе вісіць цыдулка з запрашэннем па-расійску на падрыхтоўчы курс для будучых першакласнікаў у польскамоўную школу.

Прафесар расказвае пра сябе. Мовай захапіўся яшчэ школьнікам. Народжаны ў горадзе, першыя ўрокі беларускай успрыняў як непазбежнае. А потым, калі пачуў, што дзед з бабуляй, а таксама ўся іхняя вёска гавораць на «мёртвай» мове, зразумеў, што мусіць і сам гаварыць па-беларуску. «Я хачу, каб мае дзеці ад пачатку ведалі, хто яны ёсць і чым ёсць наша мова».

Сп. Астроўскі, які свае лекцыі па біялогіі ў Медуніверсітэце чытае па-беларуску, перакананы, што беларусізацыю сістэмы адукацыі трэба пачынаць з самага верху. «Як толькі па-беларуску пачнуць вучыць ва ўніверсітэтах, то адразу бацькі пацягнуцца запісваць дзяцей у беларускія класы».




Астроўскі шмат гадоў узначальваў Таварыства вышэйшай беларускай школы, прымусова ліквідаванае ў 2006 годзе.

**На бацькоўскіх сходах агітатараў за беларускую мову сустракалі авацыямі. Але калі справа даходзіла да напісання заяваў, бацькі адмаўляліся: дзецям будзе цяжка з мовай пасля школы.**

Нібы прадчуваючы наступствы Ганебнага рэферэндума 1995 года, у 1996-м больш за 70 выкладчыкаў гродзенскіх ВНУ падпісалі адкрыты ліст да ўладаў з патрабаваннем пачаць беларусізацыю вышэйшай адукацыі, прыгадвае прафесар. Не паслухалі. Цяпер настаў час спажываць горкія плады.

Астроўскі расказвае, што на бацькоўскіх сходах іх прамовы сустракалі авацыямі. Але, калі справа даходзіла да напісання заяваў, бацькі адмаўляліся, кажучы, што дзецям будзе цяжка з мовай пасля школы.

Прафесар упэўнены, што сітуацыя зрушыцца з месца, калі таго захочуць улады. А апошнія кантакты з імі даюць нагоду для асцярожнага аптымізму. «Ці то гэта няпэўнасць перад выбарамі, ці то новы кіраўнік вобласці дэманструе іншы стыль кіравання, але зрухі да лепшага відавочныя», — кажа ён.

## «Мы не забараняем дзецям размаўляць па-расійску»

Сям’я Астроўскіх, натуральна, беларускамоўная. «Мы не прымушаем іх. За домам яны гавораць, як хочуць». Іх старэйшая дачка аднолькава добра размаўляе і чытае на абедзвюх мовах. Не адстае і сярэдні Янка, які ў наступным годзе таксама пойдзе ў школу.

«Чым больш моваў ведаюць, тым лепш. Тым цікавейшым і розным будзе для іх гэты свет. Дзве мовы ў такім узросце — гэта іх перавага », — кажа прафесар Астроўскі.

«Дзецям цяжка быць адрознымі ад сваіх аднагодкаў, а калі яшчэ і дарослыя навокал па-расійску гавораць, то гэта яшчэ складаней, — падкрэслівае ягоная жонка Аксана. — Таму нашы дзеці мусяць ведаць і гэтую мову».

Яна кажа пра недахоп дзіцячай літаратуры па-беларуску, мультфільмаў.

У Гродне, у адрозненне ад сталіцы, няма такой згуртаванасці паміж беларускамоўнымі бацькамі. «Разам збіраемся хіба толькі на Каляды». Аднак Астроўскія не сумуюць — у іх трое дзетак, а гэта ўжо нямала.

Да гутаркі далучаецца Янка. Ён расказвае верш пра слімака і жука. Забывае радок, і ў справу ўключаецца сястра. Падказвае забытае і працягвае дэкламаваць разам з ім. Самы меншы Астроўскі, Васіль, з зайздрасцю і захапленнем пазірае на старэйшых.

## «Мы мелі выбар»

Гарадзенец Аляксандр Базар прыгадвае пачатак 1990-х, калі ў беларускамоўную гімназію пайшла ягоная дачка. «Тады нам не трэба было збіраць подпісы, бо беларускамоўныя класы ўжо стварылі загадам зверху. Таму мы мелі выбар, у якую школу аддаваць дзяцей».

**Сямён Печанко, Гродна—Мінск**



# Славамір Адамовіч: «Думаю, прыехаў назаўсёды»

Скандальны паэт у чарговы раз вярнуўся ў Беларусь.

**«НН»: Чаму вырашылі зноў вярнуцца?**

**СА:** «Трэба дома бываць часцей», як пісаў мой калега некалі. Многа спраў назбіралася дома, трэба іх вырашаць.

**«НН»: Прыехалі, каб іх вырашыць, а пасля назад, у Нарвегію?**

**СА:** Думаю, прыехаў назаўсёды. Але ніхто не ведае, куды заўтра прыйдзецца рвануць.

**«НН»: А чаму ад’язджалі ў сакавіку?**

**СА:** Абумоўлена банальнымі эканамічнымі прычынамі. Складана зарабіць на жыццё. Быў у замежжы, каб падтрымаць сябе фізічна.

**«НН»: То бок зарабіць выязджалі?**

**СА:** Трэба было дарабіць там некаторыя справы.

**«НН»: Пішуць, што вярнуліся менавіта цяпер, каб прыняць удзел у з’ездзе БХД?**

**СА:** Барані божа. Да БХД не маю дачынення.

**«НН»: І чым будзеце займацца ў Беларусі?**

**СА:** Зараз бярусяаддаваць рукапісы кніжак у друк. Ёсць чалавек, літаратар, якому я давяраю. З ім паспрабуем выдаць мае кнігі. За свае грошы аўтар будзе выдаваць. На жаль. Фундатары наўрад ці з’явяцца.

**СМ**

**Славамір Адамовіч**
у сярэдзіне 1990–х правёў восем месяцаў у следчым ізалятары беларускага КДБ за верш «Забі прэзідэнта». У 2002 выехаў у Нарвегію. Там атрымаў гуманітарны прытулак. Вярнуўся ў Беларусь летам 2009. Сёлета, у сакавіку, зноў з’ехаў у Нарвегію.

# Доля беларусаў

Працяг са старонкі 1.

Другой значнай прычынай зніжэння колькасці карыстальнікаў мовы з'яўляецца татальная русіфікацыя, што ідзе зверху. Моладзь пагалоўна ведае расійскую мову, бо без яе сёння ў краіне проста немагчыма выжыць. Па-расійску працуюць дзяржустановы, сістэма адукацыі, пераважная большасць СМІ. Беларуская ж мова ў лукашэнкаўскай сістэме займае факультатыўнае месца — яна можа быць, а можа і не быць. І ніякай іншай матывацыі, апроч маральнай ці звычаёвай, для таго, каб карыстацца ёй, чалавек не мае.

Што трэба, каб колькасць беларускамоўных расла? Пабеларуску мусіць запрацаваць дзяржапарат і сілавыя структуры. Мусіць быць створаная беларускамоўная сістэма адукацыі — ад ясляў да ВНУ (**старонка 10**). Доля беларускамоўных СМІ мае вырасці хоць бы да ўзроўню патрэб дэклараваных перапісам 53%. З нацыянальнай гісторыі трэба зняць цэнзуру (**старонка 12**).

У цэлым, 53% беларускамоўных — гіганцкая лічба з улікам русіфікатарскай палітыкі апошніх пятнаццаці (або 220) гадоў. Колькасць беларускіх школаў, выданняў, тэлеканалаў, газет, якія можа прапанаваць дзяржава, у разы меншая. Свежы перапіс дае аргументы для таго, каб дабівацца забеспячэння правоў беларускамоўных людзей у зафіксаванай прапорцыі.

У якасці іншай мовы, якой валодаюць, беларускую назвалі 13,5% апытаных.

450 тысяч насельнікаў Беларусі свабодна валодаюць англійскай моваю, што ў 3,2 разу больш у параўнанні з мінулым перапісам.

## Народаў братэрскі саюз

Па стане на 2009 год у Беларусі жылі прадстаўнікі 140 нацыянальнасцяў і народнасцяў.

З нацыянальных меншасцяў па краіне чацвёрку першых займаюць расійцы (8,3%), палякі (3,1%), украінцы (1,7%) ды яўрэі (0,1%). Але расклад залежыць ад вобласці. У Мінскай і Брэсцкай абласцях, напрыклад, адсотак армянаў большы за адносную колькасць яўрэяў, у Гродзенскай вобласці шмат палякаў. У параўнанні з 1999 годам у 20 разоў павялічылася колькасць кітайцаў, але іх унёсак у статыстычную карціну застаецца нязначным.

Расійцы асімілююцца нароўні з палякамі. 20 гадоў таму іх было 13%, а цяпер засталося амаль удвая меней.

## Сярэдні ўзрост — 39,5

Дэмаграфічная нагрузка цяпер найніжэйшая за ўсю пасляваенную гісторыю, адзначаюць у статыстычным камітэце. Аднак зменшылася колькасць асобаў ніжэй працаздольнага ўзросту, за кошт якіх старэйшае пакаленне магло папаўняцца: на 560 тысяч паменела дзяцей да 15 гадоў. Гэта звязвацца з падзеннем нараджальнасці ў 1990-я.

У параўнанні з перапісам 1999 года павялічыўся і сярэдні ўзрост — ад 37 да 39,5 гадоў.

Памяншэнне насельніцтва краіны звязваюць у першую чаргу з натуральным памяншэннем ды міграцыйным патокам. На сёння нараджальнасць хоць і не перавышае смяротнасць, але паволі расце, у той час як смяротнасць паволі зніжаецца.

За апошнія 10 гадоў колькасць працаздольных жыхароў павялічылася, яна цяпер складае 5,8 млн — але гэта вынік зніжэння колькасці дзяцей.

Жыхары, якія маюць 65 гадоў і больш, складаюць у Беларусі 1 350 000 — лічбы прыблізна супадаюць з дадзенымі перапісу 1999 года. На сённяшні момант гэта 14% насельніцтва.

Цалкам 25 пытанняў перапісных анкет яшчэ не прааналізаваныя. Зрабіць гэта спецыялісты Нацыянальнага статыстычнага камітэта абяцаюць да 3 мая 2011 года.

**Юльян Місюкевіч**




**Урбанізаваная краіна**

Беларусь застаецца адной з самых урбанізаваных краінаў Еўропы, 7 мільёнаў беларусаў жывуць у гарадах, 26% нашага насельніцтва складаюць вяскоўцы. Дзесяць гадоў таму адсотак гарадскога насельніцтва складаў 69%, вясковага — 31%.

**Шчыльнасць насельніцтва ў Беларусі**

складае 46 чалавек на 1 кв. км. Для параўнання: шчыльнасць жыхароў ва Украіне — 76, Літве — 52, Латвіі — 30, Польшчы —122.

**23% утрыманцаў**

Асноўнай крыніцаю даходу 45% насельнікаў Беларусі назвалі працу. 23% знаходзяцца на бацькоўскім утрыманні, 90% з іх — моладзь да 25 гадоў.

**Брак нявестаў**

За апошнія дзесяць гадоў узрасла колькасць разводаў. У Беларусі налічваецца 4,42 млн мужчынаў і жанчынаў — 5,07 млн. На цяперашні момант, такім чынам, на 1000 мужчынаў прападае 1150 жанчынаў. Статыстычны камітэт адзначае таксама недахоп нявестаў у вёсках.

**30 тысяч непісьменных**

90% насельніцтва старэйшых за 15 гадоў маюць вышэйшую, сярэднюю альбо базавую адукацыю. Непісьменных у Беларусі 30 тысяч, большасць з іх — інваліды.

**Ёсць такая нацыя**

Да нацыі літвінаў сябе аднеслі 66 жыхароў Беларусі, тры з якіх жывуць у сельскай мясцовасці. Гэта, дарэчы, больш за колькасць японцаў, якіх у нашай краіне пражывае 23 чалавекі. Адзін чалавек назваў сябе сібірскім туркам.
















Арсень Ліс

**Gloria victis!**

Гістарычныя партрэты дзеячаў, што стваралі беларускую дзяржаўнасць.

750 старонак ад патрыярха айчыннага літаратуразнаўства.

Пытайцеся ў кнігарнях і ў незалежных распаўсюднікаў.

**У аэрапорце? У машыне? У метро? Чытай pda.nn.by з мабільніка**

Трымайце руку на пульсе pda.nn.by, дзе б Вы ні былі.

nn.by штодзённа забяспечвае аператыўныя і аб'ектыўныя навіны, ясныя каментары і аналітыку, аўтарскае відэа і фота. Усім гэтым Вы можаце карыстацца з мабільнага тэлефона. Праз ПДА–версію Вы можаце сачыць за навінамі і каментарамі, ашчаджаючы трафік. Яна зручная і сціслая.

# Аршанская бітва і тэрор на дарогах

Нацыянальныя традыцыі застаюцца забароненымі ў Беларусі.

Да людзей, што згуртаваліся каля агню на месцы Аршанскай бітвы, падыходзяць пяцёра «партызанаў» — нямногія, якім удалося ў той вечар схавацца ад міліцэйскіх ліхтароў і кустоўем прабрацца на поле. Брудныя і стомленыя, яны наперабой распавядаюць пра свае ўцёкі ў поцемках праз хмызнякі, пра аблаву. Двое мясцовых вырашылі рухацца нанач дахаты, у Оршу. На Крапівенскім полі да раніцы застаецца дзясятак беларусаў, што дабраліся на месца.

Так пачыналася асноўная частка традыцыйнага фестывалю беларускай аўтарскай песні і паэзіі «Аршанская бітва», які штогод ладзіцца ў найбліжэйшыя да 8 верасня выхадныя. Нагода для зборкі — гадавіна падзеі, згадваць якую ў савецкі час забаранялася. 8 верасня 1514 года 30-тысячнае войска Вялікага Княства Літоўскага пад кіраўніцтвам гетмана Канстанціна Астрожскага перамагло 80-тысячныя сілы агрэсара — Маскоўскага княства. Так у той далёкі час сцвердзілася права народаў Вялікага Княства на самастойнае існаванне.

Напярэдадні фестывалю поле ля памятнага каменя на загад мясцовых уладаў ўзаралі — цяпер туды немагчыма пад'ехаць ды ставіць намёты таксама няўручна. Фестываль адбываўся трохі ў іншым месцы, бліжэй да ракі Крапіўна.

Бардаўскую частку мерапрыемства выратаваў малады спявак Мікола з Рэчыцы. Пасля выступу адзінага на ўвесь вечар барда прысутныя ўключылі музычны дыск. Паслухаць яго каля гадзіны ночы падышлі міліцыянеры з відэакамерай. Супрацоўнікі праваахоўных органаў пацікавіліся, палітычнае мерапрыемства тут адбываецца ці гісторыка-патрыятычнае.

Міліцыянты, што з'явіліся на полі, папрасілі не здымаць іх, пагразіўшы ў адваротным выпадку кінуць фотаапарат у вогнішча. Толькі на раніцу двое супрацоўнікаў МУС, што падышлі павітацца з удзельнікамі фэсту, ужо ветліва патлумачылі — нельга фатаграфаваць людзей у форме.

Начныя візіцёры, пабачыўшы бел-чырвона-белы сцяг, запыталіся ў сабраных, ці знаёмы ім тэрмін «калабарацыянізм». Затым паведамілі, што знаходжанне некалькіх чалавек у лесе ля агню трапляе пад артыкул Закона аб масавых мерапрыемствах і кожны з сабраных бярэ ўдзел у несанкцыянаваных дзеяннях.

«Прайшла рэклама ў інтэрнэт, адбыўся анонс, таму вашае масавае мерапрыемства мае несанкцыянаваны характар, — зазначыў падпалкоўнік Дзяніс Рыбакоў, намеснік начальніка абласнога упраўлення ўнутраных справаў Віцебскай вобласці. — Вы не атрымалі дазволу і паводзіце сябе асабліва задзірліва».

Леанід Міхайлаў, начальнік Аршанскага райаддзела міліцыі, перапісаў пашпартныя дадзеныя ўсіх прысутных. Затрыманых на падыходах міліцыянты жартоўна называлі «тымі, што вырашылі не прысутнічаць на вашым канцэрце».

«Паглядзім, што вы напішаце ў інтэрнэце», — на развітанне зазначылі міліцыянты.

Міліцэйскія машыны ў гэтым годзе дзяжурылі на ўсіх дарогах да Крапівенскага поля. Нагоды для затрыманняў былі розныя: адсутнасць флікера, высвятленне асобы ды нават падазрэнне ў нападзе на інкасатараў і буйным рабаўніцтве. Затрыманых адвозілі ў Оршу, там перадавалі ў рукі гарадскога ці раённага аддзела МУС або транспартнай міліцыі, якая добра адпрацоўвала схему «чамадан — вакзал — цягнік».

Аляксея Трубкіна і Віталя Чарняўскага, напрыклад, двое супрацоўнікаў міліцыі суправаджалі ў электрычцы пад канвоем амаль да Мінска. Агулам да месца святкавання не змаглі даехаць, прынамсі, два дзясяткі чалавек.

Нягледзячы на прэвентыўныя затрыманні, святкаванне адбылося, хоць і без вялікага размаху. На раніцу да яго далучыўся вядомы бард Андрэй Мельнікаў. Ён адбыў 6 гадзін у аршанскім пастарунку і пехатою прыйшоў з горада. «Супрацьў з боку ўладаў сведчыць, што свята дзейнічае, — зазначыў Мельнікаў. — Гэта нагадвае штосьць акультнае». Андрэй Мельнікаў паказаў тры крыжы, пастаўленыя ў розных месцах у гонар сярэднявечнай перамогі нашых продкаў, распавёў, як з 1991 года мяняўся фармат імпрэзы.

«У мерапрыемства няма арганізатара, — кажа ўдзельнік кожнага фэсту Юрка Копцік. — Мы па завядзёнцы збіраемся на гэтым полі паспяваць, а нам замінаюць. Сёлета адбылася сапраўдная экспедыцыя супраць партызан. Нібы ў 1942-м годзе, толькі без расстрэлаў».

Стаўленне ўладаў да святкавання аршанскай перамогі ад 2006 года займела актыўна негатыўны характар, адзначаюць заўзятыя прыхільнікі фестывалю.

Першы фестываль беларускай аўтарскай песні «Аршанская бітва» адбыўся ў 1991 годзе з ініцыятывы Андрэя Мельнікава і арганізацыйнай падтрымкі журналіста Юрася Копціка. На «Аршанскай бітве» ў розныя гады выступалі многія вядомыя беларускія аўтары: Віктар Шалкевіч, Алесь Камоцкі, Зміцер Бартосік, Андрэй Хадановіч, Таццяна Беланогая, Уладзімір Арлоў. Фестываль «Аршанская бітва» — народнае свята, яго праграма не абмяжоўваецца традыцыйным канцэртам. У мінулыя гады ладзіліся паказальныя выступы рыцарскіх клубаў, фаер-шоу ды перфомансы.

У 1992 годзе намеснік старшыні Беларускага згуртавання вайскоўцаў маёр Міхась Варанец ініцыяваў прыняцце на полі вайсковай прысягі на вернасць Беларусі, а ў 2007-м планы Паўла Северынца адзначыць на фэсце дзесяцігоддзе «Маладога Фронту» справакавалі на полі міліцэйскую экспедыцыю.

У 1990-я гады пра Аршанскі народны фестываль пісала мясцовая і цэнтральная прэса, абвесткі пра мерапрыемства віселі на дошках аб'яваў у Оршы, з горада адмысловыя аўтобусы давозілі ўдзельнікаў да месца свята. Дзякуючы традыцыйнасці, з'явіліся сталыя заўсёднікі імпрэзы, якіх не пужае ні надвор'е, ні міліцэйскія пасты на дарозе.



Палямі сцякаліся людзі на поле бітвы.

**Юльян Місюкевіч, Крапіўна—Мінск**

# Скарга ад пабітага падушкай

Каля 100 чалавек адзначылі Дзень беларускай вайсковай славы бітвай падушкамі.

Бітва падушкамі на гадавіну Аршанскай перамогі была лятучай. Арганізатары скарысталі досвед падушкавага «Грунвальда» ля Нацыяналкі, які скончыўся затрыманнямі. Яны загадзя ўмовіліся пра некалькі месцаў, куды ўдзельнікі бітвы маюць пераходзіць, калі міліцыя пачне чапляцца.

Увечары 8 верасня моладзь сабралася ля фантана ў скверы Мулявіна. Адна не паспелі «ваяры» дастаць падушкі і пашыхтавацца, як да гульні далучылася міліцыя. Андрэй Кім гучна паведаміў, што акцыя ў гэтым месцы працягвацца не будзе і парэкамендаваў як найхучэй разыходзіцца. Каля шасці чалавек не паспелі збегчы і патрапілі ў пастарунак на тры гадзіны для высвятлення асобаў.

Аднак акцыя папулярызацыі беларускай гісторыі такім вось неардынарным спосабам гэтым не скончылася. Літаральна праз дваццаць хвілін усе, хто хацеў працягу свята, сабраліся ў Цэнтральным дзіцячым парку. І, не марудзячы, рынуліся біцца падушкамі, ажно пер'е ляцела.

Неўзабаве да ваяроў далучыўся арганізатар акцыі Андрэй Кім, ён прапанаваў перадыслакавацца бліжэй да ракі Свіслач. Не паспелі маладыя людзі выйсці з парку, як з'явілася міліцыя. Моладзь бегма кінулася хто куды, супрацоўнікі міліцыі ўзгадалі старую добрую гульню ў «казакі-разбойнікі» і пачалі ганяцца за тымі, хто меў падушкі. Правілы гульні былі простыя: хто не збег — трапіў у пастарунак.

Аднак, нягледзячы на затрыманні, каля трыццаці ўдзельнікаў яшчэ хвілінаў пятнаццаць лупілі адно аднаго мяккай зброяй ля Свіслачы. Міліцыя ж спыняла моладзь у наваколлі, каб праверыць, «ці не яны гэта засмецілі пер'ем парк». Прычынай затрыманняў была наяўнасць падушак у руках ці пёркі ў валасах. Пры гэтым міліцыянты на поўным сур'ёзе паведамлялі, што да іх паступіла скарга ад пабітага падушкай і яны вымушаныя разбірацца ў справе.

Страты ўдзельнікаў бітвы падушкамі, прысвечанай Дню беларускай вайсковай славы, склалі 37 чалавек. Яны трапілі ў аддзяленні міліцыі. Праз тры гадзіны затрыманых адпусцілі без складання пратакола, аднак некаторых папрасілі пакінуць падушкі. Незразумела толькі для чаго: ці то міліцыі спаць няма на чым, ці то пасля гульні ў «казакі-разбойнікі» ахоўнікі правапарадку збіраліся таксама падушкамі пабіцца для падтрымання формы.




**Настасся Шамрэй**

# Футбаліст «Нафтана» паказаў трыбунам голы зад

**Інцыдэнт адбыўся падчас гульні паміж барысаўскім БАТЭ і наваполацкім «Нафтанам» 11 верасня ў Барысаве.**

Футбаліст наваполацкай каманды Філіп Рудзік, пакідаючы поле пасля замены, адрэагаваў на свіст барысаўцаў у свой адрас. Ён зняў трусы і прадэманстраваў ім свой голы зад. Гэтая падзея аказалася па-за аб'ектывамі фота і відэакамер. Аднак гісторыю шырока абмяркоўваюць на футбольных форумах. Большасць з іх сыходзіцца на думцы, што 23-гадовы спартовец «паказаў свой сапраўдны твар».

Інцыдэнт, што адбыўся на барысаўскім гарадскім стадыёне, зусім не такі жартоўны, як магло б падацца на першы погляд. Дзеянні Рудзіка могуць быць расцэненыя як абраза БАТЭ і яе заўзятараў.

Барысаўскі клуб, тым не менш, не плануе падаваць скаргу на Рудзіка.

«Я не бачыў гэтага інцыдэнту сам. Чуў аб ім ад сведкаў. Не думаю, што будзе афіцыйная рэакцыя нашага клуба. Нам гэта не патрэбна», — пракаментаваў інцыдэнт у размове з «НН» прэс-сакратар БАТЭ Сяргей Дашкевіч.

У наваполацкай дружыне інцыдэнт увогуле не каментуюць. Трэнер «Нафтана» Ігар Кавалевіч у размове з карэспандэнтам партала goals.by адзначыў толькі, што Філіп Рудзік «не мог такога зрабіць».

З БАТЭ і яе заўзятарамі у Філіпа Рудзіка, ураджэнца Пецярбурга, адносіны не складаліся даўно. Вясной 2009 года ён у гутарцы з карэспандэнтам «Прэсбола» заявіў, што на баку БАТЭ выступаюць суддзі. За што атрымаў




папярэджанне дысцыплінарнага камітэта БФФ і нават выбачыўся перад барысаўчанамі. Аднак тыя не прабачылі і пачалі на кожнай гульні абсвістваць футбаліста.

Гульня, між іншым, скончылася перамогай БАТЭ — 1:0.

**Алесь Пілецкі**

АЎТО

## Аўтамабільныя канцэрны выпрабоўваюць абсталяванне на трупах

**Гэтая інфармацыя выклікала скандал.**

Найноўшая мадэль Ford Explorer у ЗША займее рамяні бяспекі, якія ў выпадку аварыі будуць дзейнічаць як паветраная падушка. Іх эфектыўнасць тэставалі з дапамогай трупаў, выявіў амерыканскі партал Autopia.

Аўтамабільныя канцэрны звычайна выкарыстоўваюць спецыяльныя манекены, сутыкаючы аўтамабілі, каб праверыць дзейснасць прыладаў бяспекі. Але нават нафаршаваныя электронікай сучасныя манекены не дазваляюць напоўніцу ацаніць, што адбываецца з чалавечым целам падчас здарэння.

І таму вытворцы аўтамабіляў часам без шуму тэстуюць абсталяванне на чалавечых трупах. Гэтым разам тэсты праводзіў даследчы транспартны цэнтр Мічыганскага ўніверсітэта.

Зусім нядаўна французскі «Рэно» змагаўся з хваляй крытыкі, якая паднялася, калі зрабілася вядома, што канцэрн тэстуе аўтамабілі на трупах у Кітаі. Два гады таму «Джэнерал Мотарз» і «Сааб» катэгарычна адмаўлялі, што праводзяць такія тэсты.

Аднак Autopia паведамляе, што тэсты на трупах — амаль што будзённая справа ў галіне аўтамабільнай вытворчасці. Першы прымітыўны падобны тэст правялі амерыканскія навукоўцы ў 1930-х гадах, скідваючы трупы ў шахту ліфта, каб праверыць, як дзейнічае сутыкненне на чалавечае цела. Амерыканская ўрадавая арганізацыя бяспекі дарожнага руху штогод фінансуе выпрабаванні на трупах у навучальных установах ЗША, многія з якіх атрымліваюць гранты і ад аўтавытворцаў. Спецыялісты сцвярджаюць, што такія выпрабаванні па-ранейшаму важныя, бо, хоць у мадэляванні манекенаў дасягнутыя значныя поспехі, яны ўсё адно недасканалыя.

Алберт Кінг з Уэйнскага ўніверсітэта, які праводзіў тэсты на трупах з 1966 года, у сваёй кнізе пазней паведаміў, што гэтыя выпрабаванні дапамаглі выратаваць жыццё ў дарожных здарэннях 8,5 тыс. чалавек.

**«Газета выборча»**

КАМУНІКАЦЫІ

## Tut.by зрабілі манапалістам

УП «Надзейныя праграмы», больш вядомая як Tut.by, выйграла тэндар Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры прэзідэнце на правы выступаць адзіным тэхнічным адміністратарам зоны 222.by.

Да цяперашняга часу тэхнічнае адміністраванне беларускага сегмента сеткі інтэрнэт ажыццяўляла ТАА «Адкрыты кантакт».

Па словах дырэктара «Надзейных праграм» Юрыя Зісера, яго кампаніі ўдалося перамагчы канкурэнтаў, дзякуючы найбольш нізкаму кошту даменаў. Зісер паабяцаў, што ўжо праз некалькі месяцаў кошт дамена ў сегменце 222.by знізіцца да $10—15 (у год) пры цяперашняй цане $33.

Пры гэтым колькасць рэгістратараў даменаў застанецца ранейшай — 5.

**«Еўрапейскае радыё для Беларусі»**

## Nokia зменіць галасы карыстальнікаў

Навукоўцы Стэнфардскага ўніверсітэта сумесна з вытворцамі мабільных прыладаў Nokia распрацоўваюць праграму, што змяняе голас суразмоўцы. Тлумачыцца гэта тым, што людзі з падобнымі галасамі лепш знаходзяць супольную мову. Новая праграма павінна змяніць галасы суразмоўцаў так, каб яны гучалі аднолькава.

Будуць улічаны такія параметры, як тэмп, інтанацыі, тэмбр і дынамічны дыяпазон. Такая праграма павінна дапамагчы тым, каму абавязкова трэба знайсці супольную мову з суразмоўцам. Пілотная версія праграмы выйдзе праз два-тры гады.

**ЮУ**




ЗДАРОЎЕ

## Ужываць грыбы з Піншчыны небяспечна

Сёлета ў Лунінецкім раёне ўзялі 68 спробаў грыбоў, з іх 8 проб перавышалі дапушчальныя паказчыкі па радыеактыўным цэзіі.

У Пінскім раёне правялі больш за тры тысячы праверак, і грыбы забракавалі 57 разоў. Самая жахлівая карціна ў Столінскім раёне: там спецыялісты правялі 560 замераў, і ў 159 спробах радыяцыйны фон перавышаў норму.

**«Вечерний Брест»**

АД ГАРЭЛКІ РОЗУМ МЕЛКІ

## Сябар напаскудзіў у кватэры

З адной з кватэр дома, што на вуліцы 17 Верасня ў Вілейцы, у міліцыю пазваніў 25-гадовы гаспадар і заявіў, што знаёмы мужчына проста ў яго кватэры справіў пільніцу.

Такія непрыгожыя дзеянні — адміністрацыйнае правапарушэнне. Міліцыянеры пачалі праверку. Высветлілася, што 27 жніўня каля гадзіны ночы сябры разам выпівалі. У нейкі момант яны нешта не падзялілі, і гаспадар некалькі разоў ударыў госця па розных частках цела.

Ад пабояў госць не вытрываў і напаскудзіў у кватэры. У гэтым выпадку прыцягваць да адказнасці можна было абодвух мужчын, але, працверазеўшы, абодва маладыя чалавекі заявілі ў міліцыю, што яны сябры. І не маюць адзін да аднаго ніякіх прэтэнзій. Такім чынам, інцыдэнт быў завершаны палюбоўна.

**«Рэгіянальная газета»**

ІХ ПРАБЛЕМЫ

## Кітаец выкапаў сабе кватэру

Кітайскі пенсіянер Чэн Хіньян арыгінальна вырашыў жыллёвую праблему: пабудаваў сабе падземную кватэру ў двары свайго маленькага прыватнага дома. На 50 квадратных метрах ён зрабіў калідор і спальню (плошча наземнага жытла — 20 кв. метраў).

У пакоі — бетонная падлога і сцены, ёсць ложак і шафа.

У калідоры — адсекі для захоўвання гароднiны і садавіны.

Уладкаванне жылля, кажа былы шахцёр, абышлося яму ў $147. «Я хачу, каб мае дочкі жылі ў добрых умовах», — патлумачыў сваю ідэю Хіньян. Па яго словах, новае жыллё ў іх раёне прадаецца па цане $735 за квадратны метр. Пры гэтым на дваіх з жонкай яны атрымліваюць пенсію $397.

Мясцовыя ўлады абяцаюць, што арыгінальная кватэра будзе зарэгістраваная як жыллё для маламаёмных.

**«Сегодня»**

ЛЮБОШЧЫ

## Малавядомыя факты пра сэкс

• Адзін палавы акт спальвае 360 калорый.

• У прыродзе толькі два віды сысуноў займаюцца сэксам для задавальнення — людзі і дэльфіны.

• Жаночы аргазм — вельмі моцны болесуцішальны сродак (так як у арганізме вылучаецца вялікая колькасць эндарфінаў). Так што галаўны боль — дрэннае апраўданне нежадання займацца сэксам.

• У дзень ва ўсім свеце больш за 100 мільёнаў пар займаецца любошчамі.

• Кожны год 11000 амерыканцаў атрымліваюць траўмы, выпрабоўваючы новыя позы для заняткаў сэксам.

• У 1919 годзе трансплантолаг Сяргей Воранаў перасадзіў палавыя залозы самца малпы чалавеку.

• Прэзерватывы былі вынайдзены ў пачатку 1500 года доктарам Чарльзам Кандомам для Генрыха VIII. Выраблены ён быў са слізістай абалонкі кішэчніка авечкі.

• Чынгіз-Хан памёр падчас палавога акта.

• У ЗША ў сярэднім здзяйсняецца тры аперацыі па перамене полу ў дзень.

• Людзі, якія п'юць каву, займаюцца сэксам часцей і атрымліваюць ад гэтага большае задавальненне, чым



тыя, хто не п'е кавы.

• У старажытнай Афрыцы ў якасці супрацьзачаткавых сродкаў выкарыстоўвалі коканы розных раслін.

• Арлы могуць займацца сэксам у палёце і часта падаюць на зямлю, не паспяваючы скончыць. На тое яны і арлы...

**svadbavrn.info**

ЛАСУНКІ

## Глыбоцкі МКК мадэрнізуе выраб згушчонкі

У цэху будзе праведзеная маштабная рэканструкцыя і заменена тэхналагічнае абсталяванне. Тэндар на яго пастаўку выйграў італьянскі вытворца. Да канца года ён паставіць комплексную лінію магутнасцю 330—350 бляшанак за хвіліну, якая будзе ўключаць поўны цыкл вытворчасці прадукта ад падрыхтоўкі тары да пакавання. Кошт абсталявання складае 2 млн еўра. Яго ўвод у эксплуатацыю прызначаны на першы квартал 2011 года.

Яшчэ адным важным праектам сёлета для прадпрыемства стала рэканструкцыя халадазабеспячэння з заменай аміячных кампрэсараў. Сродкі, накіраваныя на гэтыя мэты, склалі каля Br3 млрд. У цэлым за 2010 год камбінат мае намер інвеставаць у асноўны капітал каля Br15 млрд.

**westki.info**



**18 верасня. «Мінск-Арэна» (пр.Пераможцаў, 111).** Стынг (Гордан Самнер) у суправаджэнні каралеўскага філарманічнага аркестра. з праграмай «Сімфонісіці» і найлепшымі песнямі. **Пачатак а 20-й.** Квіткі ад 120 000 да 1 500 000.

# Стынг, памяркоўны рызыкант

Ён мяняе стылі як пальчаткі, яго імя — устойлівы брэнд. Ён выдатна ведае, што прадае: рамантычнасць, пяшчоту і спелую сэксуальнасць. Хіліцца да сталай аўдыторыі, якая ў курсе ўсіх людскіх перажыванняў, але для дуэтаў запрашае маладых рэпераў і спевакоў. Усё гэта Стынг, памяркоўны рызыкант.

## Шавец з ботамі

Так, Стынг — басіст, які рэдка грае на басе, і рокер, які рэдка грае рок. Пасля росквіту гурта Police ў 1984-м Стынг звярнуўся да сольнай кар'еры. Кінуў гуляцца ў наватара і стаў іграць на сутыку стыляў: джазу, шансону і этнічнай папсы. Рокеры «паважалі дзядзьку» за песню Roxanne, аматары ж попу праніклісся наскрозь лірычным Shape of My Heart / «Абрыс майго сэрца».

Стынг адчувае час: гэтак, у 1985 годзе ён уразіў усіх песняй з першага, плацінавага, альбома Dream of the Blue Turtles, Russians/«Расійцы». Псеўдасімфанічны саўнд з папулярнымі на той час украпленнямі з савецкіх радыёэфіраў. У тэксце ж, ужо не надта мудруючы, Стынг выявіў страх сярэдняга заходнееўрапейца перад ядзерным ударам і выказаў усеагульнае спадзяванне, што «савецкія людзі таксама любяць сваіх дзетак».

А яшчэ песня They Dance Alone/«Яны танчаць адны», напісаная Стынгам у памяць аб ахвярах чылійскіх рэпрэсіяў.

## І на дудзе ігрэц

Пасля Стынг зняўся ў блокбастары. «Карты, грошы, дзве рулі» прынеслі Гаю Рычы славу кінападрыўніка. Стынг засвяціўся ў фільме некалькі хвілін, але на ўсіх афішах пісаўся ўпоравень з паўвядомымі акцёрамі. Публіка ішла на Стынга, а атрымлівала файны фільм (без Стынга).

Стынг ведае формулу поспеху, але не заўсёды пільнуецца яе. Ну, навошта ён палез у 2007 годзе співаць перад узбекскім дыктарам Ісламам Карымавым? У якасці процівагі варта зазначыць, што цягам трыццаці гадоў Стынг дапамагаў праваабарончай арганізацыі Amnesty International і ўласнымі фунтамі ратаваў трапічныя нетры Бразіліі.

Вынік неўтаймаваных блуканняў Стынга: музычная насычанасць са стылістычнымі дамешкамі з усіх куткоў свету і часцяком нетрывіяльныя тэксты песень. Пошук часам няўдалы, але публіка заўсёды можа ацаніць сам факт пошуку. Публіка прыходзіць на яго канцэрт, як на алімпійскія спаборніцтвы, каб убачыць, у якую сёння позу паставіць Стынг гэтыя няшчасныя сем нот і якія экзатычныя інструменты і падпявалы яму дапамогуць у гэтым.

20 верасня Стынг будзе першым, хто выпрабуе траву на познанскім стадыёне перад Чэмпіянатам Еўропы па футболе, які адбудзецца ў Польшчы і Украіне ў 2010-м. Два дні да гэтага на прадмет прафпрыдатнасці ён пратэстуе будучую гаспадыню Чэмпіянату па хакеі — 2014, «Мінск-Арэну».

**Ліза Кавальчык**

## ХАКЕЙ

**Уладальнік Кубка Гагарына ў Мінску**

**21 верасня Мінск** у рамках рэгулярнага першынства Кантынентальнай хакейнай лігі наведае казанскі «Ак барс» (у перакладзе з татарскай — «Белы барс»). Летась гэтая каманда стала ўладальнікам Кубка Гагарына, постсавецкі аналаг Кубка Стэнлі. А праз два дні ў беларускую сталіцу наведаецца яшчэ адзін клуб з Татарстана — ніжнекамскі «Нафтахімік». Супернікаў трэніруе вядомы па працы са зборнай Беларусі Уладзімір Крыкуноў. Матчы пройдуць у «Мінск-Арэне». **Пачатак а 19-й.**

## ФУТБОЛ

**БАТЭ стартуе ў Кіеве**

Барысаўскі БАТЭ пачне барацьбу ў групавым этапе Лігі Еўропы матчам у Кіеве з мясцовым «Дынама». Гульня адбудзецца **16 верасня на стадыёне імя Лабаноўскага. Пачатак а 20-й.** Клуб заўзятараў БАТЭ запрашае падтрымаць каманду ва Украіне. З Барысава едзе некалькі адмысловых аўтобусаў. Выезд 15 верасня а 20-й. Прыезд — 16 верасня а 8-й. Выезд у Барысаў назад адразу па сканчэнні гульні. Кошт праезду — не больш за 80 000 руб. Каб забраніраваць месца, трэба пазваніць па тэлефоне (029) 630-20-93.

## ІМПРЭЗЫ

**Талькаўскі фэст**

**3 кастрычніка** — Талькаўскі фэст. **Збор а 12-й каля клуба.** Падрабязнасці — www.talka.info. Т.: (01713)-71410, e-mail: talka5@tut.by.

**Каб восенню — вясновa...**

**5 верасня а 18-й у Літаратурным музеі Максіма Багдановіча (вул.М.Багдановіча, 7а)** адбудзецца творчы вечар Галіны Каржанеўскай «Каб стала восенню — вясновa...», прысвечаны юбілею паэткі. Яе павіншуюць сябры і прыхільнікі, землякі, настаўнікі і вучні, прадстаўнікі літаратурных выданняў і грамадскіх суполак, прагучаць любімыя песні.

## КАНЦЭРТЫ

**Cezarykonradtrio**

**26 верасня ў Вялікай зале Філармоніі (пр. Незалежнасці, 50) а 19-й** — канцэрт джазавай музыкі **Cezarykonradtrio** з удзелам Цэзарыя Конрада (барабаны), Марка Напюркоўскага (гітара) і Роберта Кубішына (бас-гітара). Музыка трыа — гэта, перадусім, элементы джазу і прагрэсіўнага року, які спецыялісты акрэсліваюць як «fusion». У выкананні Конрада, Напюркоўскага і Кубішына гэта выклік для слухачоў. Для менш дасведчанай публікі — магчымасць здзейсніць падарожжа ў невядомае з найлепшымі праваднікамі. Для знаўцаў — шанс пачуць гэтыя патрабавальныя гукі ў майстэрскім выкананні.

**Лісіная нара запрашае**

**У «Лісінай нары» (вул.Калінoўскага, 32) 15 верасня** — аўтарскі вечар паэта і музыкі **Алеся Камоцкага**.

**Графіці**

**17 верасня а 19-й у «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — вечар лацінаамерыканскай музыкі з гуртам **Libertad** (Балівія).

**Люстра душы**

**15 верасня а 19-й у Малой зале Філармоніі імя Р.Шырмы** — канцэрт фартэпіяннай музыкі «Люстра душы», прымеркаваны да 200-годдзя з дня народзінаў Фрыдэрыка Шапэна. Выканаўца — лаўрэат міжнародных конкурсаў **Аляксандр Палякоў**.

## ВЫСТАВЫ

**Дамы-музеі: выкшталцоны стыль італьянскага жыцця**

**15 верасня а 17-й у Гістарычным музеі** адкрываецца выстава «Дамы-музеі: выкшталцоны стыль італьянскага жыцця», на каторай можна будзе ўбачыць выявы дзесяці італьянскіх дамоў-музеяў — ад вілы Джузэпэ Вердзі ў Эміліі да Габрыэле Д'Анунцыё на возеры Гарда, ад апартаментаў сям'і Савоя ў Турыне да Палаца Мірта ў Палерма.

**Нябачаная Літва**

**У Мастацкім музеі ад 16 да 18 верасня** працуе выстава фотаздымкаў Марыюса Явайшы «Нябачаная Літва». Альбом «Нябачаная Літва» — найвялікшае і найбольш паспяховае літоўскае выданне аэрафатаграфіі, у якім аўтар зафіксаваў найпрыгажэйшыя аб'екты і з'явы ды сцены прыроды, тым самым сцёла пашырыўшы межы традыцыйнай аэраграфіі. Самыя прыгожыя выявы былі адабраны з амаль 20 тысяч кадраў. Гэта альбом фотаздымкаў з вышыні птушынага палёту, які не мае ў Літве аналагаў.

**Надзея Рыгораўна Грэкава — дзяржаўны дзеяч**

**Тамсама 16 верасня** адкрываецца выстава «Надзея Рыгораўна Грэкава — дзяржаўны дзеяч», дзе можна пазнаёміцца з жыццём і дзейнасцю Н.Грэкавай — Старшыні Вярхоўнага Савета Беларусі (1938–1947), намесніцы старшыні Савета Народных Камісараў БССР, міністра харчовай прамысловасці БССР, першага намесніка міністра харчовай прамысловасці РСФСР, члена Цэнтральнай Рэвізійнай Камісіі ВКП(б).

**Карані**

**У мастацкай галерэі «Палац мастацтва»** працуе персанальная выстава Аляксандра Кошалева «Карані», прымеркаваная да 50-годдзя мастака. Закінутыя сядзібы, палескія прасторы, красаванне садоў, гудзенне пчол — усё гэта тэмы ягоных прац. Серыя прац прысвечана мясцінам, звязаным з жыццём М.Агінскага, Я.Чачота...

**Зямля пад белымі крыламі**

**У Мастацкім музеі працуе мегавыстава** «Зямля пад белымі крыламі», на якой можна ўбачыць працы звыш 300 аўтараў — народных мастакоў Беларусі, лаўрэатаў Дзяржаўнай прэміі, стыпендыятаў спецыяльнага фонду прэзідэнта па падтрымцы таленавітай моладзі. Выстаўляюцца і творы, набытыя музеем за апошнія дзесяць гадоў.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## ТЭАТРЫ

**15 верасня**

**Тэатр оперы і балета** — «Шчаўкунок»

**Тэатр імя Горкага** — «Праўда — добра, а шчасце — лепей»

**Тэатр беларускай драматургіі** — «Мужчыны на мяжы нервовага зрыву»

**16 верасня**

**Тэатр оперы і балета** — «Мадам Батэрфляй»

**Тэатр імя Горкага** — «Я веру ў гараскопы»

**17 верасня**

**Тэатр оперы і балета** — «Стварэнне свету»

**Купалаўскі тэатр** (Малая сцэна) — «Старамодная камедыя»

**Тэатр лялек** — «Драй швэстэрн» (для дарослых)

**18 верасня**

**Тэатр лялек** — «Кот у ботах»

**Тэатр юнага гледача** — «Маленькі лорд Фаўнтлерой»

**Тэатр імя Горкага** — «Я веру ў гараскопы»

**Тэатр оперы і балета** — «Яўгеній Анегін»

**19 верасня**

**Тэатр лялек** — «Марынка-крапіўніца»

**Тэатр оперы і балета** — «Чароўная Музыка»

**Тэатр юнага гледача** — «Вандраванне ў княства Сноў»

**Тэатр лялек** — «Марынка-крапіўніца»

**Тэатр оперы і балета** — «Лебядзінае возера»

**22 верасня**

**Тэатр оперы і балета** — «Дзікае паляванне караля Стаха»

**Тэатр лялек** — «Драй швэстэрн» (для дарослых)

**Купалаўскі тэатр** — «Офіс»

**Купалаўскі тэатр** — «Тэатраманія»

**23 верасня**

**Тэатр імя Горкага** — «Свабодны шлюб»

**Купалаўскі тэатр** — «Вечар»

**Тэатр оперы і балета** — «Севільскі цырульнік»

**Купалаўскі тэатр** — «Офіс»

**24 верасня**

**Купалаўскі тэатр** — «Маэстра»

**Тэатр оперы і балета** — «Іаланта»

**Тэатр юнага гледача** — «Тарас на Парнасе»

**Тэатр імя Горкага** — «Расейскія вадэвілі»

**25 верасня**

**Тэатр юнага гледача** — «Тры парсючкі»

**Тэатр імя Горкага** — «Расейскія вадэвілі»

**Тэатр оперы і балета** — «Кармен»

**Купалаўскі тэатр** — «Макбет»

**26 верасня**

**Тэатр лялек** — «Піпі Доўгаяпанчоха»

**Тэатр юнага гледача** — «Тры парсючкі»

**Купалаўскі тэатр** — «Чорная панна Нясвіжа»

**Тэатр оперы і балета** — «Спартак»

**Тэатр імя Горкага** — «Свабодны шлюб»

## КІНО

# Апошняе забойства Джорджа Клуні

**Амерыканец** (The American)

ЗША, 2010, каляровы, 105 хв.

**Рэжысёр:** Антон Карбэйн

**Ролі выконваюць:** Джордж Клуні, Ірына Б'ёрклунд, Ларс Эльм, Паала Баначэлі, Сільвана Бозі

**Жанр:** Драма паводле рамана Марціна Бута

**Адзнака:** 5 (з 10)

Пасля забойства ворагаў і палюбоўніцы дасведчаны кілер (Джордж Клуні) вырашае сысці на пакой. Ён абірае ціхае італьянскае мястэчка і маскуецца пад фатографа. Пранікліві святар адчувае, што герой зусім не той, за каго сябе выдае. Але душагубу замаўляюць апошнюю справу — вырабіць бясшумную зброю. Хто ахвяра — не павёдамляецца.

Другая стужка фатографа і кліпмейкера Антона Карбэйна — статычная драма пра пакуты сумлення. Іх і спрабуе выразіць Клуні. Выходзіць непераканаўча. Затое з'яўляюцца амурныя сцэны...

Пры жаданні можна палічыць стужку метафізічным ландшафтам амерыканскай душы.

**Андрэй Расінскі**



# Што пра чалавека кажа почырк?

Часам па почырку пра чалавека можна даведацца больш, чым пры размове. Ад асаблівасцяў характару да наяўнасці хваробаў сэрца і лёгкіх. Напрыклад, калі ў вашым почырку ў верхніх петлях літар сустракаюцца прабелы, гэта значыць, што варта звярнуць увагу на сэрца — магчыма, не ўсё ў парадку.

Спецыялісты па почырку могуць амаль упэўнена дыягнаставаць неўрозы, алкагалізм, наркаманію, схільнасць да самагубства, істэрыю і нават сухоты.

Але, каб даведацца што-небудзь цікавае пра чалавека, які даслаў вам ліст, не абавязкова быць графолагам. Кожны можа скарыстацца наступнымі крытэрамі.

### Нахіл

Нахіл літар выражае стаўленне аўтара да рэспандэнта.

Яскравы нахіл улева паказвае, што аўтар — інтраверт, які не дае волі эмоцыям. Людзі з левым нахілам у почырку часта баяцца будучыні. Лёгкі нахіл улева, што цікава, не сведчыць пра гэтыя характарыстыкі.

Калі літары не нахіляюцца ўвогуле — чалавек можа быць вельмі практычны, які хавае ад вас усялякія эмоцыі. Уздзейнічаць на яго вам будзе цяжка.

Самы прыемны ў адносінах чалавек, у якога на пісьме літары маюць лёгкі правы нахіл. Тут праяўляюцца і эмацыйнасць, і прагматызм. Але ні тое, ні тое не з'яўляецца празмерным.

Калі ж літары моцна нахілены ўправа — перад вамі крайні экстраверт, які ставіцца да жыцця лёгка. Для такіх людзей характэрны імпульсіўныя рашэнні і ў нейкай ступені — бяздумнасць.

### Накірунак радка і водступ

Звярніце ўвагу на тое, як выглядае напісаны вамі радок. Калі літары ідуць уніз — значыцца, варта паспрабаваць ставіцца да жыцця з меншай засцярогай. Такі почырк характэрны для песімістаў. Калі ж наадварот — і вашы радкі імкнуцца кудысьці ўверх, то вы — аптыміст, менавіта такія людзі часцей за ўсё падыходзяць да любой справы з вялікім энтузіязмам.

Роўны почырк выкрывае ў чалавеку сапраўднага рэаліста, які дзейнічае па абставінах, але эмоцыі якога не ідуць праз край. А вось калі радкі мяняюць свой кірунак — тады можна смела казаць пра схільнасць да крайніх станаў: калі ўжо весела, дык нястрымна, а калі дэпрэсія — дык самая глыбокая.



Усе варыянты подпісаў — ад людзей празмерна сціплых да аматараў «пакрасавацца».



Почырк з рэзкім ухілам. Выкрывае ў аўтары лёгкае стаўленне да жыцця, а таксама манію велічы.




Подпіс з міжлітарным інтэрвалам. Аўтар гэтага подпісу павінен быць досыць самаўпэўненай асобай з лёгкім стаўленнем да жыцця.

Не меншае значэнне мае водступ. Стаўленне да адрасата добра прасочваецца, калі паглядзець на інтэрвал паміж верхнім краем старонкі і тэкстам.

Шырокі водступ — прыкмета вялікай павагі да адрасата, жаданне спадабацца. Вузкі — наадварот: ці абыякавае стаўленне, ці адсутнасць павагі. З іншага боку, вузкі водступ часам дазваляюць сабе вельмі блізкія людзі, якія на падсвядомым узроўні ўжо даўно даказалі адзін аднаму сваю павагу.

### Памер літар і подпіс

Буйны почырк характэрны для людзей самаўпэўненых. Такі чалавек зробіць усё запланаванае «як трэба», прычым як трэба яму і ў яго разуменні. Ціснуць на такога чалавека, імкнуцца яго ўпэўніць у адваротным — бессэнсоўна. А вось скканцэнтравацца такому чалавеку цяжка, затое пакрасавацца — гэта калі ласка.

Людзі з дробным почыркам звычайна сціплыя, але вельмі адказныя. Засяродзіцца на нейкай адной справе ў іх атрымліваецца шыкоўна. Калі ўжо такі чалавек нешта задумаў — ён гэтага даб'ецца, хоць і зробіць гэта ціха з кропкі гледжання астатніх.

Шмат пра што можна даведацца з прынцыпу «злучэння» літар. Менавіта гэты аспект ілюструе інтэлектуальную дзейнасць аўтара. Чалавек, які не дапускае разрываў паміж літарамі, — логік, і кожнае ягонае рашэнне мае пад сабой лагічны фундамент. Калі разрывы сустракаюцца зрэдку — гэта ўжо спалучэнне логікі і інтуіцыі. А вось разрывы паміж усімі літарамі — гэта прыкмета легкадумнасці, а таксама творчага складу асобы.

Калі вы заўважылі, што характар подпісу вельмі розніцца ад почырку, гэта кажа пра тое, што чалавек імкнецца стварыць вобраз, а ў жыцці ён абсалютна іншы. Калі нахіл літар подпісу не адпавядае нахілу літар асноўнага тэксту, хутчэй за ўсё такі чалавек добра прыстасоўваецца да абставінаў.

Падкрэслены подпіс кажа пра ўпэўненасць у сабе, магчыма, нават празмерную. Асабліва калі росчырк складаны і доўгі. Калі ж росчырк штучна ўпрыгожаны завіткамі — гэта ўжо простае самалюбаванне і жаданне знаходзіцца ў цэнтры ўвагі.

**Юрась Ускоў**

# Перамагаем бяссонніцу



Ці даводзілася вам пакутаваць ад бяссонніцы? Змагацца з ёй цяжка, ніякія там авечкі, што скачуць праз плот, якіх варта пералічыць, не дапамогуць.

Ад бяссонніцы найлепш дапамагаюць шматлікія адвары і настоі, а таксама мёд. Увогуле, у народнай медыцыне існуе больш за 150 рэцэптаў, якія робяць адыход да сну больш камфортным.

Самыя распаўсюджаныя — рэцэпты з мёдам.

Напрыклад, тры гарбатныя лыжкі яблычнага воцату трэба размяшаць у шклянцы з мёдам. Дзве лыжкі атрыманай сумесі перад сном — і праз паўгадзіны вы будзеце моцна спаць. Мёд з воцатам гэтаксама дапаможа, калі вы прачнецеся сярод ночы і не зможаце больш заснуць. А можна адну лыжку мёду размяшаць у шклянцы з вадой і выпіць — танізуе мёд добра. Такімі самымі ўласцівасцямі валодае лавандавае масла — ім можна змазаць кавалачак цукру і рассмактаць перад сном.

Таксама дапамогуць настоі валяр'яны і мяты. У прынцыпе, пасуюць любыя заспакаяльныя адвары траваў.

З чым трэба быць насамрэч асцярожным — снатворнае. Лепш за ўсё ўвогуле адмовіцца ад яго, але калі вы адчуваеце, што гэта адзіны ваш шанец заснуць, то для правільнага падбору снатворнага лепш звярнуцца да доктара. Снатворныя сродкі не ўніверсальныя — калі вы зранку павінны актыўна дзейнічаць, то палова таблетак вам не пасуе, — ёсць рызыка агульнай кволасці цягам першай паловы дня.

Што яшчэ паляпшае сон? Вось яшчэ трохі разумных правілаў.

Не ешце пасля 18-й ці, як мінімум, пасля 19.00. Гэты просты ў выкананні спосаб дапаможа не толькі схуднець — проста арганізму, перагружанаму ежай, цяжэй заснуць. Калі жаданне што-небудзь з'есці ўсё ж перамагае — дазвольце сабе шклянку кефіру ці трошкі садавіны.

Добра прыняць ванну з экстрактам хвоі ці марской соллю.

Калі вы любіце паслухаць музыку, то ад бяссонніцы вас выратуе класіка, напрыклад, Моцарт. Менавіта яго музыка аказвае добры тэрапеўтычны эфект. Ён таксама ратуе ад дэпрэсіі. Калі Моцарта ў вас няма, можна паслухаць паўгадзінкі спакойную інструментальную музыку ці запісы кшталту «Шум мора». А некаторым дапамагае раўнамерны гук уключанага вентылятара.

Яшчэ адзін правераны метад — сэкс. Пасля сэксу арганізм расслабляецца і імкнецца адпачываць. Менавіта сэксам лепш за ўсё і лечыцца бяссонніца — у дадатак у арганізме пачынаюць выдзяляцца рэчывы, што выклікаюць сон. Таму ўсе байкі пра «адвярнуўся да сцяны і пачаў храпці» выяўляюцца абсалютна лагічнымі.

Існуе таксама метад, да якога ўсе ставяцца з гумарам: трэба пачытаць якую-небудзь сумную кнігу. Псіхолагі кажуць, што таксама падыходзіць для засынання вывучэнне іншамоўнай граматыкі — дзве-тры старонкі, і засынанне вам забяспечана. Калі раптам не спрацуе, можна такім чынам вывучыць мову — лішнім не будзе.

Калі ў вас ёсць сабака, то адпраўцеся з ім на прагулку на паўгадзіны — свежае паветра спрыяе рэлаксацыі арганізма. Падчас прагулкі імкніцеся пазбегчы размоў пра надзённыя праблемы.

І галоўнае — не перажывайце з-за бяссонніцы: спініце яе гэта не дапаможа, а вось расцягнуць — дакладна. Перажыванні на арганізме адбіваюцца яшчэ горш, чым уласна сама бяссонніца.

**ЮУ**

## Сапраўдная беларуская кухня

### Струдаль з яблыкамі

**340 г мукі, дзве лыжкі масла, 1,4 кг яблыкаў, 0,5 кубка цёртай булкі, 3 лыжкі масла, 0,25 кубка разынак, 0,5 кубка цукру, трохі солі, вады**

Насыпаць муку на дошку, зрабіць усярэдзіне лагчыну, уліць трохі летняй вады, дадаць 2 лыжкі масла, трохі солі. Зрабіць цеста і качаць рукамі, аж пакуль перастане клеіцца да рук. Цеста мусіць застацца мяккае. Тады накрыць цёплай судзінай і пакінуць на паўгадзіны. У тым часе абабраць яблыкі, парэзаць на тонкія скрылікі. Падсмажыць цёртую булку, падрыхтаваць разынкі і цукар. Цукру браць у адпаведнасці з тым, наколькі кіслыя яблыкі.

Калі цеста паляжала 0,5 гадзіны, накрыць вялікі стол абрусам, абрус пасыпаць мукой. Качалкай трохі раскачаць цеста на дошцы, потым расцягнуць рукамі, аж пакуль цеста не будзе прасветнае і не будзе перасягаць дошку. Добра памазаць берагі цеста шчотачкай, памочанай у масле.

Выцягненае цеста абкроіць з няроўных берагоў, пасыпаць палавіну цеста яблыкамі са смажанай булкай і разынкамі. Другую палову цеста папырскаць маслам, як і скручаны ніжні бок цеста, скруціць, пакласці на змазаную бляху, пячы каля 45 хвілінаў. Як спячэцца, пакроіць на лусты, злажыць на міску і пасыпаць цукрам-парашком.

**З кнігі Вінцэнты Завадскай «Літоўская кухарка», 1854**
**Падрыхтавала НБ**

## Прыватныя абвесткі

**ШУКАЮ**

**Шукаю жыхара Мамлыг**, народжанага ў 1933 г. Капцюга Гаўрылу Еўдакімавіча. Звесткі ў Рэдакцыі.

**КНІГІ**

**Прадам** гістарычныя раманы пра М.Кутузава, С.Разіна, Д.Данскога і іншыя творы. Вельмі танна. Т.: 8–01645–30002.

**БЕЛАРУСКІЯ ТАНЦЫ**

**У кавярні «Жар-птушка»** адкрыўся чарговы танцавальны сезон. У Парку Горкага шточацвер а 19-й вас чакаюць дуда, гармонік, скрыпка і бубен. Беларускія і суседнія народныя танцы.

**Прыватныя абвесткі ў «НН»** (не больш за 15 словаў) можна падаць бясплатна. Дасылайце поштай (а/с 537, 220050, Мінск) ці праз e-mail (nn@nn.by) або размяшчайце на форуме сайта www.nn.by. Дык скарыстайцеся!

## Кемікі



1) Маці паклала на талерку 3 памідоры і панесла іх сваім траім дзецям. Як падзяліць іх паміж дзецьмі, каб кожны атрымаў па адным памідоры і на талерцы яшчэ застаўся адзін?

2) У кошыку 10 яблыкаў. Трэба раздаць іх дзесяці хлопчыкам, кожнаму па яблыку, і каб адзін яблык застаўся ў кошыку. Як гэта зрабіць?

3) Хлопчык зрабіў шпакоўні і рашыў іх павесіць на дрэвы, якія раслі каля хаты. Калі хлопчык павесіць па адной шпакоўні на дрэва, то адзін птушыны домік застанецца. Калі ж ён павесіць па дзве шпакоўні на дрэва, то адно дрэва застанецца без шпакоўні. Колькі дрэў і колькі шпакоўняў?

**Сабрала Валянціна Карнялюк.**

**Адказы глядзі на старонцы 16.**



Лазернае трохвымернае шоу на фасадзе Палаца Рэспублікі на свята Мінска. 11 верасня.


Канада. Пратэст супраць дзейнасці нафтавых кампаній напярэдадні Сусветнага энергетычнага кангрэса.


У Лепелі ўрачыста адкрылі помнік славутаму канцлеру ВКЛ Льву Сапегу. У свой час ён валодаў гэтым горадам. Ініцыяваў стварэнне помніка пробашч мясцовай каталіцкай парафіі ксёндз Андрэй Аніскевіч.





Фідэль Кастра прызнаўся ў гутарцы з амерыканскім журналістам, што «кубінская мадэль развіцця краіны больш не пасуе нават нам». А потым узяў свае словы назад: маўляў, меў на ўвазе не Кубу і сацыялізм, а ЗША і капіталізм. На фота: аптэка ў Гаване.

## Анекдоты

* * *

— Разумееш, Аня, калі я гляджу футбол, я забываюся пра ўсё на свеце.

— Мяне завуць Марына.

* * *

— Добры дзень. Прабачце, я — ваш сусед зверху. Мяне залівае!

— Але прычым тут я? Мая кватэра — пад вашай!

— Ведаю, ведаю. Але мой сусед зверху з'ехаў на месяц у вёску, а мне жонка загадала неадкладна штосьці небудзь зрабіць.

* * *

Наведнік рэстарана, робячы замову, прызнаўся афіцыянту, што ніколі не еў салаты з амараў. Таму і з'еў салату з крабавых палачак па цане амараў.

* * *

Кажуць, грэчкі можна здабыць у нейкага касманаўта ...

* * *

Жонка заклала маразілку мясам, курыцай, нейкімі катлетамі і з'ехала на два тыдні ... У выніку пяльмені класці няма дзе! Есці хачу, паміраю з голаду!

* * *

На прызыўной камісіі прызыўнік так моцна імкнуўся «адкасіць» ад войска, што проста там паступіў на акторскае аддзяленне Акадэміі мастацтваў.

* * *

Галоўны крытэр падчас выбару шпалераў — каб на іх былі добра бачныя мухі і камары.

## «НН» сто гадоў з вамі

**Беларускі вечар у Дзісне.** Жыве беларускі народ і ніякія сілы ворагаў не затрымаюць яго! Гарачае дзякуй шчыраму беларусу Ігнату Буйніцкаму, каторы, не шкадуючы сіл сваіх і працы, устроіў гэтую вечарыну і быў тутака першым танцорам! Дзісенскія беларусы будуць доўга помніць гэта.

**Адзін з публікі.**
**«НН». № 35. 1910.**

Усе бягуць адсюль, адзін ляціць сюды, як на крылах. Славамір Адамовіч паведаміў пра сваё заўчаснае вяртанне з творчага стажу ў ЗША. Ён мае вярнуцца ў Менск у кастрычніку, а не ў красавіку наступнага года, як планавалася раней. Паэт не можа без радзімы.

**«НН». № 37. 2000.**

**Адказы да старонкі 15:**
1) Адзін памідор эдзаць разам з талеркай. 2) Адзаць кошык з яблыкам. 3) 4 шпакоўні, 3 дрэвы.

Наша Ніва
незалежная газета
заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991
галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).
сакратарка рэдакцыі Наста Бакшанская
шэф-рэдактар Андрэй Дынько
галоўны рэдактар Андрэй Генадзевіч Скурко
заснавальнік Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
выдавец Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»
АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:
220050, Мінск, а/с 537
Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.
E-mail: nn@nn.by
On-line: www.nn.by
© НАША НІВА. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая. 12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП №02330/0494179 ад 03.04.2009. Пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных абвестак. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №248 ад 22 чэрвеня 2009 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Мінск, вул. Асаналіева, 15–128. Р/р 3012206280014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Мінск, код 764.
Наклад 6410. Газета выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 14.09.2010.
Замова № 4488.
Рэдакцыйны адрас: Асаналіева 15–128.
Цана дамоўная.
ISSN 1819-1614
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12